**ЗЬМЕСТ**

**ЧАСТКА I. Як заснаваць Эўрапейскі клюб у школе?**

**ЧАСТКА II. Мэтадычны дапаможнік для стваральнікаў школьных эўрапейскіх клюбаў**

1. Магчымыя кірункі дзейнасьці Эўраклюбу..............…...............
2. Эўрапейскі дзень у школе...............................……….............
3. Анкета “Быць эўрапейцам”...........................………..…..........
4. Інтэграцыйныя й навучальныя сэмінары..................…............
   - 4.1. Сэмінар для падлеткаў “Я й сучасны сьвет”....…………
   - 4.2. Сэмінар-трэнінг “Што такое дэмакратыя?”……………....
5. Школьны дыскусійны клюб………………………………………
   - 5.1. Як заснаваць школьны дыскусійны клюб........…………
   - 5.2. Мэтадычныя распрацоўкі тэматычных паседжаньняў моладзевага дыскусійнага клюбу Менску..........................

**ЧАСТКА III. Магчымасьці далучэньня да эўрапейскіх праграмаў..**

*Кароткія зьвесткі пра аўтараў*......................................................

## ЧАСТКА I

## ЯК ЗАСНАВАЦЬ ЭЎРАПЕЙСКІ КЛЮБ У ШКОЛЕ?

Няма дакладных інструкцыяў да працэдуры стварэньня ЭШК. Кожная школа можа зрабіць гэта па-свойму, зыходзячы з умоваў, рэсурсаў, асаблівасьцяў і стану выхаваўчай працы ў школе. Пры стварэньні ЭШК трэба ўлічваць магчымасьці школы, рэальныя ўмовы, у тым ліку матэрыяльныя, якія змогуць забясьпечыць выкананьне задуманага. Перш за ўсё арганізатар ЭШК мусіць дакладна вызначыць мэты й задачы, зьмест і кірункі дзейнасьці, магчымых партнэраў.

Напачатку стварэньня ЭШК не павінен разьлічваць на нейкае асаблівае становішча ў школе, бо ён ствараецца й існуе на правах нефармальнай арганізацыі. Лепш за ўсё, калі ён увальецца ў сыстэму выхаваўчай працы ў школе й знойдзе сваю нішу пры выкананьні агульнашкольных задачаў, будзе працаваць у шчыльнай сувязі зь іншымі клюбамі й гурткамі (напрыклад, *лектарская група, клюб "Інтэлект", клюб "Гістарычны мэрыдыян").*

Мінімум, неабходны для стварэньня ЭШК: ініцыятыва настаўніка, група зацікаўленых вучняў, згода дырэктара школы.

**Мэты стварэньня ЭШК:**

- Папулярызацыя ідэі Эўрапейскага Зьвязу сярод настаўнікаў, вучняў і іхных бацькоў.
- Пашырэньне ведаў пра краіны ЭЗ.
- Разьвіцьцё грамадзянскай і нацыянальнай сьвядомасьці вучняў: усьведамленьне Беларусі як часткі Эўропы, вывучэньне сваёй культуры, мовы, традыцыяў як часткі агульнаэўрапейскіх каштоўнасьцяў.
- Выхаваньне эўрапейскай сьвядомасьці, пачуцьця адказнасьці грамадзяніна Эўропы за бясьпеку ўсіх народаў, абарону правоў асобы, захаваньне чысьціні навакольнага асяродзьдзя.
- Усьведамленьне неабходнасьці вывучэньня замежных моваў.
- Стварэньне ўмоваў для ўсталяваньня кантактаў, сяброўскіх, партнэрскіх сувязяў з іншымі Эўрапейскімі школьнымі клюбамі.
- Навязаньне й разьвіцьцё кантактаў з раўналеткамі ў ЭЗ.

**Якім павінен быць апякун ЭШК?**

**1. Апякун ЭШК вызначаецца сваімі ўласнымі перакананьнямі ў ідэі эўрапейскай інтэграцыі.**

Немагчыма быць апекуном ЭШК і самому не ўспрымаць ідэі эўрапейскай інтэграцыі. Таму ў гэтай ролі мусіць выступаць асоба, якая мае эўрарэалістычныя ці эўрааптымістычныя пазыцыі. Паколькі ЭШК зьяўляюцца праваднікамі ідэі эўрапейскай інтэграцыі, настаўнік, які стварае клюб, павінен сам мець дастаткова грунтоўныя веды ў гэтым пытаньні (ці прынамсі імкнуцца да гэтага).

**2. Апякун ЭШК мае добрыя дачыненьні з вучнямі й умела абапіраецца на іх у рэалізацыі эўрапейскай ідэі.**

Настаўнік павінен мець добры кантакт з вучнямі, уласны ўплыў на іх, быць аўтарытэтным, мець дастаткова вольнага часу й уласнага жаданьня, каб пераканаць іншых. Вакол ідэі ўтварэньня ЭШК неабходна стварыць атмасфэру зацікаўленасьці, неардынарнасьці, незвычайнасьці.

**3. Апякун ЭШК знаходзіць падтрымку ў адміністрацыі й калегаў.**

Стварэньне ЭШК ня можа быць вырашана аўтарытарна, накшталт: “Клюбу быць”. Спачатку ідэя павінна зьявіцца, а надалей ёю спакваля трэба падзяліцца з настаўнікамі й вучнямі, якія ў будучыні змогуць, на думку ініцыятара, стаць добрымі дарадцамі. Ідэя павінна пачаць працаваць “у масах”. Безумоўна, нейкім чынам трэба давесьці яе да дырэктара, бо шмат будзе залежаць ад ягонай падтрымкі. Ня варта пры гэтым проціпастаўляць сябе й ідэю стварэньня ЭШК дзяржаўнай палітыцы. Наадварот, трэба як мага часьцей зьвяртацца да ідэяў эўрапейскага вымярэньня ў адукацыі, пунктаў Балёнскай дэклярацыі, плянаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі прыняць Закон аб вышэйшай адукацыі, адной з галоўных мэтаў якога будзе прызнаньне беларускіх дыплёмаў у Эўропе. Карацей, трэба пераканаць адміністрацыю, што ЭШК – толькі рашучы крок наперад ў кірунку пашырэньня ведаў пра Эўропу, выхаваньня эўрапейскай сьвядомасьці ў вучняў і настаўнікаў. Для краіны, якая знаходзіцца ў цэнтры Эўропы, гэта натуральна.

**4. Апякун умела спрыяе шчырай зацікаўленасьці вучняў.**

І ўсё ж такі найперш – дачыненьні з вучнямі, бо менавіта ад іх залежаць вынікі працы. Пэўна, трэба пачынаць размову з вучнямі тых клясаў, у якіх выкладаеш. Распавядзіце ім пра ідэю ЭШК і ягоныя магчымасьці:

клюб дапаможа ім ня толькі пашыраць свае веды пра Эўропу, вывучаючы культуру эўрапейскіх дзяржаваў ня толькі з кніжак ці відэа, але й супольна бавіць вольны час, арганізоўваючы цікавыя гульні, конкурсы, вечарыны. Зьявіцца магчымасьць наладзіць кантакты з раўналеткамі замежжа, якія маюць падобныя клюбы.

**Як зацікавіць вучняў**

Каб зацікавіць вучняў, неабходна выканаць шэраг умоваў:

1. Праца ў ЭШК сваёю формаю павінна істотна адрозьнівацца ад пазакляснай працы ў школе;
2. Яна не павінна паўтараць тое, што ўжо вядома вучням са школьнай праграмы;
3. Навізна павінна прысутнічаць ва ўсім: назве ЭШК, ягоным лягатыпе, спосабах інфармаваньня й правядзеньня акцыяў;
4. Усё, што ладзіць ЭШК, павінна быць пабудавана на зацікаўленасьці, эмацыйнасьці, займальнасьці;
5. У аснове дзейнасьці ЭШК павінна быць жывая справа; вельмі важна праводзіць рэгулярныя сустрэчы з цікавымі асобамі; дарэчы, гэта могуць быць і самі вучні, якія пабывалі ў краінах ЭЗ;
6. У працы ЭШК абавязкова маюць прысутнічаць элемэнты гульні й спаборніцтва, напр., рэгулярныя конкурсы эўрапейскай тэматыкі з узнагароджваньнем пераможцаў.

**Прыкладныя этапы стварэньня ЭШК**

- Настаўнік, зацікаўлены ў ЭШК, вывучае магчымасьці яго стварэньня, вылучае вучняў, настаўнікаў, зь якімі пакрысе дзеліцца думкамі аб стварэньні ЭШК.
- Адбываецца першае спатканьне ініцыятыўнай групы вучняў і настаўніка, зацікаўленага ў стварэньні ЭШК, дзе абмяркоўваюць праект працы клюбу, вызначаюць галоўныя мэты, задачы й кірункі працы. Настаўнік павінен зацікавіць вучняў пэрспэктывамі дзейнасьці. Вучнёўская група ня мусіць быць вялікай: колькасьць яе – 7-10 чалавек. Не абавязкова, што гэта вучні, якія вылучаюцца выдатнымі ведамі; лепш за ўсё, калі гэта будуць нефармальныя лідэры з розных клясаў, крыху

знаёмыя адно з адным. Таму першую частку спатканьня было б лепш прысьвяціць іхнаму знаёмству паміж сабой. Ужо падчас першай нефармальнай сустрэчы вучні павінны бачыць мапу Эўропы, адрозьніваць краіны – удзельніцы Эўразьвязу, краіны, якія маюць намер стаць імі, месца сваёй дзяржавы сярод іншых.

- Прыкладны плян дзейнасьці падаецца на разгляд дырэктару школы, вучнёўскаму самакіраваньню. Бяз згоды й зацьверджаньня пляну працы ЭШК дырэктарам дзейнасьць клюбу ня мае афіцыйнае базы. "Ініцыятыўная група" можа зьвярнуцца да дырэктара са сваім праектам, пры гэтым заручыўшыся падтрымкай настаўнікаў, якіх апякун ЭШК змог пераканаць у важнасьці справы.

- Плян падаецца на зацьверджаньне пэдагагічнай радзе. Добра было б, каб гэта зрабілі самі вучні, што спрыяла б папулярызацыі ідэі сярод настаўнікаў школы й узмацніла разуменьне пэдагагічнае значнасьці справы.

- Пра стварэньне ЭШК трэба паінфармаваць вучняў, настаўнікаў, бацькоў. Гэта можна зрабіць рознымі шляхамі, залежна ад магчымасьцяў школы: паведамленьні праз радыёвузел, інфармацыйны стэнд, школьную газэту, улёткі, спэцыяльныя плякаты пра пэрспэктывы дзейнасьці Эўрапейскага школьнага клюбу, паведамленьні на бацькоўскім сходзе. Уся інфармацыя мусіць быць яскравая, маляўнічая, адразу прыцягваць увагу.

- Час зьвярнуцца да распрацоўкі Статуту ЭШК. Гэта вельмі важны дакумэнт, ён вызначае арганізацыйныя бакі дзейнасьці клюбу, яго мэтавае прызначэньне. Статут надае ЭШК легітымнасьць, дазваляе зарэгістраваць ЭШК як грамадзкую школьную моладзевую арганізацыю. Статут прымаецца на агульным сходзе ўсіх сяброў клюбу *(гл. Дадатак 1)*.

- Паколькі ЭШК будзе папаўняцца, патрэбна распрацаваць парадак уступленьня ў яго. Тым ня менш, колькасны склад ЭШК не павінен быць вялікі: аптымальна – чалавек дваццаць актыўных сяброў. Калі больш -- будзе цяжэй забясьпечваць трывалыя кантакты. ЭШК павінен быць у пэўнай ступені "элітарнай" арганізацыяй. Каб стаць яго сябрам, трэба мець жаданьне й магчымасьці нешта рабіць для ідэі. А вось колькасьць арганізацыяў, зь якімі кантактуе ЭШК, хай будзе як найбольшай. Урэшце, зразумела, што колькасны склад ЭШК будзе мяняцца, бо арганізацыя жывая й абсалютна новая; трэба адразу ўсьвядоміць, што зь цягам часу некаторыя вучні, якіх не захопіць ідэя ЭШК, пакінуць клюб, іншыя, наадварот, захочуць актыўна працаваць.

- Падчас наступных спатканьняў трэба ўзгадніць форму рэалізацыі пляну, выбраць кіраўніцтва клюбу, разьмеркаваць абавязкі й заданьні паміж усімі. Магчыма арганізаваць гэта за прыкладам

дэмакратычных выбараў, з абавязковым абмеркаваньнем плятформаў кандыдатаў на пасаду старшыні Рады. Вельмі важна, каб школьнікі ў клюбе займаліся справамі, якія яны любяць, якія ў іх найлепш атрымоўваюцца. Гэта неабходна ўлічваць пры разьмеркаваньні абавязкаў. Пры гэтым важна акрэсьліць і правы кожнай асобы.

- Каб выбраць назву клюбу й стварыць ягоны лягатып, лепш правесьці конкурс сярод вучняў школы, з умовамі якога пазнаёміць усіх праз абвесткі й плякаты.
- Сябрам клюбу патрэбнае памяшканьне для працы й сустрэчаў. Можна зьвярнуцца да дырэктара школы. Хутчэй за ўсё гэта будзе кабінэт настаўніка – апекуна клюбу. Трэба паклапаціцца пра выгляд памяшканьня, зь цягам часу аздобіць яго інфармацыйнымі стэндамі пра краіны Эўразьвязу, плякатамі, календарамі.
- Варта зьвярнуцца да Інтэрнэту, пазнаёміцца са справамі тых ЭШК, якія існуюць ужо даўно, маюць добры досьвед, падрабязна апісаныя на старонках іхных сайтаў.
- Перад афіцыйным адкрыцьцём ЭШК усе сябры клюбу павінны ясна ўсьведамляць сабе мэты й задачы, плян дзейнасьці клюбу на год, сваё месца й ролю ў яго выкананьні. Плян ЭШК – важны дакумэнт, да якога доступ мае кожны сябар клюбу, і плян павінен знаходзіцца на адкрытым месцы.

Плян можа мець прыблізна такую форму:

| **Тэрмін выка-наньня** | **Справа** | **Формы рэалізацыі й патрэбныя сродкі** | **Хто арганізуе й удзельнічае** | **Магчымыя партнэры** | **Адказны за выка-наньне** |
|---|---|---|---|---|---|
| 01 лютага -10 сакавіка 2004 г. | Усталяваньне сувязяў са Эўрапейскімі школьнымі клюбамі Польшчы з мэтай вывучэньня спэктру іхнае працы. Акрамя таго, магчымыя тэмы для абмеркаваньня:<br>-- сярод вучняў: асаблівасьці навучаньня, адпачынку, працаўладкаваньня на вакацыях, разьвіцьцё мастацкіх здольнасьцяў вучняў, вывучэньне магчымасьцяў сумеснага адпачынку;<br>-- сярод настаўнікаў – абмен досьведам у выхаваньня й выкладаньня прадметаў. | Арганізацыя перапіскі праз E-mail з:<br>1) Euro-Junior, Szkoła Podstawowa w Bostowie;<br>2) Euroklubik, Szkoła im. Henryka Sienkiewicza;<br>3) Sokrates, Gimnazjum w Budzowie;<br>4) Eurostrada 10, Zespół Szkół Ogólnokształcących nr 10;<br>5) Młodzi Europejczycy, sosw nr 2 – Szkoła Podstawowa nr 46;<br>6) Klub Europejski, Liceum nr 47 im.Roberta Shumana w Warshawie – www.primus.com.pl.<br>Патрэбныя выдаткі на паслугі Інтэрнэту. | Вольга, Марыя,<br>Андрэй,<br>сэктар інфармацыі,<br>настаўнік польскай мовы | Беларускае Шуманаўскае Таварыства | Вольга |

Кожнае новае спатканьне трэба пачынаць з аналізу выканананьня пляну, зь інфармацыі ад асобы, якая мела пэўнае даручэньне.

## Магчымыя партнэры ЭШК у школе й па-за яе межамі

Новастораны ЭШК паведамляе пра сябе Беларускаму Таварыству імя Рабэра Шумана, якое стварае базу зьвестак пра ЭШК на тэрыторыі Беларусі. Дзякуючы гэтаму ЭШК можа разьлічваць на сумесную працу зь іншымі клюбамі. Створаны ЭШК дасылае падрабязную інфармацыю пра сябе: назва клюбу, час паўстаньня, назва й нумар школы, адрас, тэлефон, e-mail, прозьвішча й імя апекуна клюбу, мэты й кірункі дзейнасьці ЭШК, пэрспэктывы далейшай распрацоўкі праекту.

Каб дзейнасьць ЭШК сапраўды мела добрыя вынікі, клюбу патрэбныя трывалыя сувязі й падтрымка як унутры школы, так і далёка па-за яе межамі. У кожнай школе гэта будзе вырашацца па-рознаму, але, магчыма, будзе выглядаць прыкладна так:




На этапе станаўленьня ЭШК павінен і мае права атрымліваць мэтадычную, інфармацыйную, матэрыяльную падтрымку. Пры рэалізацыі плянаў апекуну ЭШК трэба сьмялей зьвяртацца да калегаў, а таксама да кіраўнікоў вышэйзгаданых пазашкольных установаў і завязваць зь імі кантакты. Практычна ўсе яны маюць уласныя старонкі ў Інтэрнэце. На эўразьвязаўскую тэматыку часта абвяшчаюцца конкурсы, у якіх маюць права ўдзельнічаць ЭШК.

## Урачыстае адкрыцьцё ЭШК

І вось практычна ўсё падрыхтавана. Клюб мае Статут, памяшканьне, плян дзейнасьці, ухвалены дырэктарам і Пэдагагічнай радай, настаўніка-кіраўніка, поўнага сілаў, энэргіі, жаданьня рэалізацыі мэты, паплечнікаў, а самае галоўнае – вучняў, захопленых ідэяй. Наступае час урачыстага адкрыцьця ЭШК. На адкрыцьцё клюбу неабходна запрасіць ганаровых гасьцей: сярод іх могуць быць прадстаўнікі амбасадаў замежных дзяржаваў, замежныя студэнты, дэпутаты, творцы (напр., мастацкія перакладнікі з эўрапейскіх моваў на беларускую), прадстаўнікі

Беларускага Таварыства імя Рабэра Шумана. Добра, калі на пачатку адкрыцьця ўрачыста прагучыць гімн Эўрапейскага Зьвязу “Ода радасьці”, уступнае слова дырэктара школы. Будзе агучаны й прыняты Статут ЭШК, яшчэ раз падкрэсленыя мэты й задачы клюбу. Сябрам клюбу ўручаюцца нагрудныя знакі. Падводзяцца вынікі конкурсу на лепшы лягатып клюбу. Гучыць канцэрт у выкананьні вучняў школы – песьні, танцы, літаратурныя творы эўрапейскіх народаў.

Ад самага пачатку дзейнасьці ЭШК трэба надаваць вялікую ўвагу распаўсюду інфармацыі пра ягоныя справы. Гэта магчыма праз школьны радыёвузел, насьценны друк, старонку ў друкаванай газэце.

**Формы дзейнасьці ЭШК**

Ніжэй пададзеныя формы дзейнасьці ЭШК. У залежнасьці ад магчымасьцяў школы ЭШК выбірае тое, што можа выканаць. Безумоўна, патрэбная абавязковая падтрымка з боку дырэктара школы, настаўнікаў, бацькоў.

| № | Форма дзейнасьці | Арганізацыйныя пытаньні |
|---|---|---|
| 1. | Зьбіраньне інфармацыйных матэрыялаў | Кожны сябар ЭШК мае сваё заданьне зьбіраць матэрыялы з газэтаў, часопісаў на эўрапейскую тэматыку. Можна выкарыстаць газэту “Белорусский рынок”, дадатак “Европейский выбор”. Падчас спатканьняў кожны сябра прэзэнтуе найцікавейшыя, на ягоную думку, матэрыялы. Сабраныя й абмеркаваныя такім чынам інфармацыйныя матэрыялы могуць быць выкарыстаныя пры падрыхтоўцы лектарскай групы.<br>У бібліятэцы стварыць інфармацыйны аддзел адпаведнай тэматыкі. |
| 2. | Насьценная газэта | Сябры клюбу павінны клапаціцца, каб іхная дзейнасьць была вядомая школе. Таму патрэбна зьвярнуцца да дырэктара школы з просьбай вылучыць месца для пастаяннага інфармацыйнага стэнду ЭШК. |
| 3. | Газэта ЭШК | Калі ў школе выдаецца газэта, патрэбна дамовіцца пра старонку ў ёй альбо сталую рубрыку. Сябры клюбу зьмяшчаюць там матэрыялы аб працэсах інтэграцыі ў Эўропе.<br>Яшчэ лепш для гэтых мэтаў мець уласную газэту. Але гэта вымагае пэўных выдаткаў на паперу й друк, таму адразу трэба шукаць сабе спонсараў. |

| | | |
|---|---|---|
| 4. | Конкурсы | o *Удзел у школьных конкурсах.*<br><br>Конкурс на лепшую эмблему клюбу, пячатку, нагрудныя знакі сяброў клюбу.<br><br>Конкурс ведаў пра Эўропу (гістарычны).<br><br>“У межах Эўропы” (геаграфічны)<br><br>Конкурс літаратурны (вершы, эсэ, творы, ліст сябру...)<br><br>o *Удзел у пазашкольных конкурсах.*<br><br>Інфармацыю пра такія конкурсы можна знайсьці ў Інтэрнэце:<br><br>**http://www.men.waw.pl,** альбо праз Беларускае Шуманаўскае Таварыства. |
| 5. | Тэматычныя выставы | Такія выставы лепш рыхтаваць цэлымі клясамі. “Візытоўка краіны Эўразьвязу” – мапа дзяржавы, агульныя зьвесткі, палітычныя, гаспадарчыя, культурныя, адукацыйныя, турыстычныя цэнтры, знакамітыя людзі (палітыкі, навукоўцы, дзеячы культуры, спорту, ляўрэаты Нобэлеўскай прэміі). |
| 6. | Эўрапейскі тыдзень | Можна прымеркаваць да Дня Эўропы 9 траўня.<br><br>Лепш, калі гэта стане агульнашкольнай падзеяй, да ўдзелу ў якой трэба далучыць бацькоў.<br><br>У межах Тыдня можна заплянаваць і правесьці:<br><br>• Сустрэчы з прадстаўнікамі амбасадаў.<br><br>• Паказ відэафільмаў, слайдаў.<br><br>• Інфармацыйныя лекцыі пра гісторыю, культуру, традыцыі дзяржаваў.<br><br>• Выставы сувэніраў з падарожжаў.<br><br>• Дэгустацыя страваў нацыянальнай кухні.<br><br>• Паказ нацыянальных строяў.<br><br>• Паказ нацыянальных танцаў. |
| 7. | Прэзэнтацыя дзяржаваў Эўразьвязу | Гэта можа быць як самастойнай акцыяй, так і часткай Эўрапейскага тыдню. Праводзіцца таксама ў межах школы.<br><br>Кожная кляса выбірае, якую дзяржаву будзе прадстаўляць, зьбірае адпаведны матэрыял, выбірае форму прэзэнтацыі.<br><br>Арганізатарам падзеі выступае ЭШК, які клапоціцца пра яе ўрачыстасьць, упрыгожваньне залі, дапамагае зь інфармацыйнымі матэрыяламі. |
| 8. | 9 Траўня –<br><br>Дзень Эўропы | ЭШК рыхтуецца, каб зрабіць гэты дзень урачыстым:<br><br>• Сьвяточны выпуск газэты;<br><br>• Арганізацыя выставы, прысьвечанай ЭЗ. |

| | | |
|---|---|---|
| 9. | Дыдактычныя матэрыялы | Сябры клюбу рыхтуюць гульні, віктарыны, крыжаванкі, загадкі на тэмы Эўропы й ЭЗ. |
| 10. | Дэбаты, спатканьні, | Можна скарыстаць мэтадычныя распрацоўкі, зьмешчаныя ў частцы II гэтай кнігі, альбо зьвярнуцца па дапамогу Беларускага Шуманаўскага Таварыства, Цэнтру “Супольнасьць”, мясцовых дэпутатаў. Да ўдзелу ў гэтых падзеях сябры ЭШК могуць запрасіць вучняў старэйшых клясаў. |
| 11. | Клюб у Інтэрнэце | Інтэрнэт адкрывае вялікія магчымасьці для працы. Пажадана, каб кожны ЭШК меў доступ у Інтэрнэт і сваю старонку. Так сябры клюбу маглі б расказаць пра сябе, свае справы, мэты, знайсьці сяброў, ліставацца зь імі праз электронную пошту, удзельнічаць у дыскусіях. |
| 12. | Школьны радыёвузел | Калі ў школе ёсьць радыёвузел, сябры клюбу могуць прасіць эфірнага часу для інфармацыі пра ЭЗ і ЭШК. Можна скарыстоўваць аўдыёкасэты адпаведнае тэматыкі. |
| 13. | Хроніка клюбу | Вядзецца зь першага дня ў выглядзе, найбольш прыязным для ЭШК |
| 14. | Рэклямныя матэрыялы | Патрабуюць матэрыяльных выдаткаў. Але пры наяўнасьці спонсара гэта могуць быць: візытоўкі, нагрудныя знакі, паштоўкі, пячаткі, эмблемы, плякаты, улёткі, хусткі, майкі... |
| 15. | Іншыя формы дзейнасьці | Моўныя курсы, вывучэньне мультымэдыйнага курсу “Hello Europe”, сустрэчы зь сябрамі іншых ЭШК падчас паездак за мяжу. |

## Дакумэнтацыя ЭШК

Уся праведзеная праца ЭШК фіксуецца ў адмысловым журнале. Гэта спрыяе захаваньню традыцыяў ЭШК, стварэньню летапісу, дапамогае праводзіць маніторынг якасьці працы ЭШК, плянаваць далейшую працу.

Прыкладна журнал выглядае наступным чынам.

На вокладцы – назва ЭШК, калі быў створаны, кірункі працы. На першай старонцы эмблема ЭШК, на наступных – дэвіз і Статут.

Далей ідзе сьпіс Рады ЭШК, анкетныя зьвесткі яе сяброў. У склад Рады ЭШК уваходзяць старшыня, намесьнік, яшчэ 5-7 чалавек. Рада выбіраецца, як правіла, на год. У журнале запісваецца разьмеркаваньне абавязкаў.

Затым – сьпіс усіх сяброў клюбу з адрасамі, кантактнымі тэлефонамі, электроннымі адрасамі (калі ёсьць).

Вельмі важна ствараць **традыцыі** ЭШК. Такімі традыцыйнымі справамі могуць быць вечарыны, прысьвечаныя гісторыі, культуры, традыцыям асобных краінаў, экскурсіі, стварэньне летапісу клюбу.

## Рада ЭШК

У склад Рады клюбу павінны ўвайсьці самыя энэргічныя й ініцыятыўныя вучні. Сябрамі Рады могуць быць і дарослыя, кіраўнікі гурткоў ды іншых клюбаў, зь якімі будзе супрацоўнічаць ЭШК. Рада выбірае старшыню й намесьніка. Працу клюбу лепш сплянаваць па сэктарах. Неабходна, каб кожны сябра Рады меў канкрэтны кірунак дзейнасьці.

Галоўная задача Рады – сплянаваць цікавае жыцьцё ЭШК, стаць арганізатарам усіх захапляльных справаў. Рада зьбіраецца рэгулярна, не радзей як штотыдзень. Новыя рашэньні прымаюцца толькі пасьля выкананьня папярэдніх. Усё, што вырашаецца на Радзе, павінна быць адразу вядомае ўсім сябрам ЭШК. Рашэньні й інфармацыю лепш разьмяшчаць на стэндзе “Паведамляе Рада ЭШК”.

Абавязкам Рады зьяўляецца распрацоўка Статуту, дэвізу, вызначэньне парадку працы ЭШК.

## Статут ЭШК

Статут ЭШК вызначае мэту дзейнасьці клюбу й яе арганізацыйныя бакі. Гэта асноўны дакумэнт. Яго распрацоўваюць кіраўнік клюбу й ініцыятыўная група, але прымае агульны сход усіх сяброў клюбу.

У Статуце павінна быць вызначана:

- зь якой мэтай ствараецца ЭШК, якія задачы будзе вырашаць;
- хто мае права быць сябрам клюбу;
- якія правы й абавязкі маюць сябры клюбу;
- якімі прынцыпамі кіруецца клюб у сваёй працы.

У дадатку 1 падаецца прыкладны ўнутрышкольны статут Эўрапейскага Школьнага Клюбу. Пры жаданьні й адпаведнай дапрацоўцы ён можа паслужыць асновай статуту для рэгістрацыі моладзевай (дзіцячай) грамадзкай арганізацыі.

**Дадатак 1**

**Статут Школьнага Эўрапейскага Клюбу**

**пры школе X у мясцовасьці Y***

**Разьдзел I**

**Агульныя палажэньні**

§1

Эўрапейскі школьны клюб пры школе X у мясцовасьці Y -- дабрахвотнае аб'яднаньне, якое мае мэтай разьвіцьцё й прапаганду ініцыятываў, палажэньняў і справаў, якія спрыяюць ..............................., стварэньне атмасфэры даверу й спадзяваньня на ............, а таксама далучэньне да......................., арганізацыйна аб'ядноўвае фізычных асобаў, якія прымаюць гэтыя прынцыпы.

§2

Сядзіба Клюбу разьмяшчаецца ў школе X у мясцовасьці Y.

§3

Клюб створаны зь ініцыятывы школьнай моладзі пры падтрымцы Беларускага Шуманаўскага Таварыства. Клюб дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі.

§4

Клюб можа быць удзельнікам нацыянальных і міжнародных мерапрыемстваў, якія маюць падобныя мэты дзейнасьці.

§5

Час дзейнасьці Клюбу неабмежаваны.

§6

Апекуном Эўрапейскага школьнага клюбу ёсьць настаўнік школы, які ўваходзіць у Пэдагагічную раду школы X у мясцовасьці Y, вылучаны вучнямі – сябрамі Клюбу на ўстаноўчым паседжаньні Агульнага сходу.

§7

Клюб рэалізуе мэты праз:

1. усебаковую прапаганду ідэі эўрапейскай інтэграцыі;
2. сумесную працу й узаемную дапамогу сяброў Клюбу;
3. супрацоўніцтва з асобамі й інстытутамі ў сфэры атрыманьня інфармацыі й абмену досьведам дзеля шырокага ўсьведамленьня ідэі эўрапейскай інтэграцыі;
4. зьбіраньне дакумэнтаў і інфармацыі, якая тычыцца дзейнасьці Клюбу;
5. арганізацыю Цэнтру эўрапейскай інфармацыі;
6. правядзеньне й удзел у сустрэчах рознага тыпу (нарады, канфэрэнцыі, дэбаты, сэмінары);
7. арганізацыю выставаў, прэзэнтацыяў, паездак, экскурсіяў;
8. распрацоўку ўлётак, бюлетэняў;
9. удзел у міжнародным абмене моладзі;
10. супрацоўніцтва зь іншымі Эўрапейскімі школьнымі клюбамі.

§8

Клюб мае ўласную эмблему,..................

Эўрапейскі школьны клюб пры школе X у мясцовасьці Y вул. ..................

* Гэты прыкладны статут перакладзены з польскай мовы й можа выкарыстоўвацца як прыклад унутранага палажэньня аб дзейнасьці ЭШК. Для адаптацыі статуту да зьменлівага беларускага заканадаўства з мэтай яго рэгістрацыі трэба пракансультавацца зь юрыстамі.

**Разьдзел II**

**Кіраўнічыя органы Клюбу**

§1

Кіраўнічымі органамі Клюбу ёсьць:

1. Агульны сход, у якім бяруць удзел усе сябры Клюбу.

2. Рада Клюбу, у склад якой уваходзяць: старшыня, намесьнік старшыні, сакратар, скарбнік і пэдагагічны апякун.

3. Рада ў колькасьці пяці асобаў выбіраецца з усіх удзельнікаў Агульнага сходу праз роўнае, прамое, адкрытае галасаваньне бальшынёю галасоў (50%+1) па заканчэньні справаздачнага году, але не пазьней за 30 студзеня наступнага году.

4. Старшыня, намесьнік старшыні, сакратар, скарбнік выбіраюцца на першым сходзе кожнага справаздачнага году адкрытым галасаваньнем бальшынёю галасоў. Кіраўніцтва Клюбу ў 2-тыднёвы тэрмін пасьля выбараў падае гадавы й трохгадовы плян сваёй дзейнасьці.

5. Рада падае Агульнаму сходу гадавую справаздачу. Агульны сход зацьвярджае ці адхіляе справаздачу.

6. Справаздачны год доўжыцца зь першага студзеня да трыццаць першага сьнежня актуальнага каляндарнага году.

§2

Вышэйшай уладай ёсьць Агульны сход сяброў Эўрапейскага школьнага клюбу. У яго кампэтэнцыю ўваходзіць:

1. Зацьверджаньне праграмы дзейнасьці Клюбу.
2. Унясеньне зьменаў у Статут.
3. Разгляд скаргаў сяброў Клюбу наконт дзейнасьці Рады Клюбу.
4. Абмеркаваньне дзейнасьці Рады й рэалізацыі праектаў.
5. Кантроль над фінансамі Клюбу й разьмеркаваньне фонду Клюбу праз скарбніка.

**Разьдзел III**

**Сяброўства й маёмасьць Клюбу**

§1

Сябрам ЭШК можа быць кожны вучань школы X у мясцовасьці Y пасьля атрыманьня пасьведчаньня сябра Клюбу:

1. які зацікаўлены ў мэтах і задачах клюбу, пагаджаецца зь імі й будзе спрыяць іх выкананьню праз сваю працу ў клюбе;
2. жадае й мае магчымасьць прысьвяціць свой вольны час працы ў клюбе;
3. прагне паглыбіць свае веды пра эўрапейскія краіны, разьвіць сваё мысьленьне;
4. мае дазвол працаваць у клюбе ад бацькоў ці асобаў, якія іх замяняюць.

ЭШК ствараецца на прынцыпах дабрахвотнасьці. Выхад з Клюбу адбываецца на падставе пісьмовай заявы, у якой тлумачыцца яго прычына.

Кожны сябар Клюбу мае права на:

1. прапановы наконт дзейнасьці Клюбу;
2. прыняцьце рашэньняў, якія тычацца Клюбу, на паседжаньнях Агульнага сходу;
3. выкарыстаньне памяшканьня, тэхнічных і дыдактычных сродкаў, якія належаць Клюбу;
4. удзел ва ўсіх даручаных заданьнях і ў арганізацыі імпрэзаў Клюбу.

§2

Маёмасьць Клюбу складаецца з дабрахвотных складак сяброў Клюбу, датацыяў недзяржаўных арганізацыяў, ахвяраваньняў, даходу з уласнай дзейнасьці, іншых не забароненых законам крыніцаў.

Кожны сябра Клюбу павінен дбаць пра захаваньне й пашырэньне ўласнасьці Клюбу.

Скарбнік мусіць весьці дакумэнтацыю ўсіх даходаў і выдаткаў Клюбу, а таксама здаваць гадавую фінансавую справаздачу да 30 студзеня штогод.

**Разьдзел IV**

**Заключэньне**

§1

1. Клюб пачынае сваю дзейнасьць на падставе рашэньня Ўстаноўчага сходу.

2. Агульны сход зацьвярджае ўмовы ліквідацыі Клюбу, вырашае пытаньні пераразьмеркаваньня ягонай маёмасьці.

3. Калі справы ня могуць быць урэгуляваныя гэтым Статутам, у сілу ўступае Закон аб грамадзкіх арганізацыях.

**Частка II**

## МЭТАДЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК
## ДЛЯ СТВАРАЛЬНІКАЎ ШКОЛЬНЫХ ЭЎРАПЕЙСКІХ КЛЮБАЎ

Зараз усё больш увагі надаецца патрыятычнаму й грамадзянскаму выхаваньню ў школе. Форма Эўрапейскага клюбу вельмі прыдатная, каб даць вучню грамадзянскія веды (як уладкаванае чалавечае грамадзтва, паводле якіх законаў яно існуе, як знайсьці сваё месца ў ім) і навучыць яго арыентавацца ў сучасным сьвеце, быць актыўным і пасьпяховым.

У гэтым разьдзеле мы прапануем магчымыя кірункі дзейнасьці эўрапейскіх школьных клюбаў, а таксама мэтадычныя парады, карысныя для пачынальнікаў і кіраўнікоў школьных клюбаў. Зьмешчаныя ніжэй мэтадычныя матэрыялы былі распрацаваныя альбо адаптаваныя зь міжнароднага досьведу беларускімі пэдагогамі.

### 1. Магчымыя кірункі дзейнасьці Эўраклюбу

- Інтэграцыйныя й навучальныя сэмінары для сяброў школьнага Эўраклюбу
- Супрацоўніцтва са школамі Эўразьвязу: сустрэчы, сымпозіюмы, сумесныя сэмінары й навучаньне, моладзевыя форумы, міжнародныя вучнёўскія канцэрты
- Сустрэчы з навукоўцамі, грамадзкімі й палітычнымі дзеячамі, супрацоўнікамі амбасадаў, дзеячамі культуры
- Канфэрэнцыі (*“Праз адукацыю ў Эўропу”*)
- Выставы (фота, малюнкі й г.д) (*“Акно ў Эўропу”*)
- Эўрапейскія імпрэзы (*“Песьні й танцы краінаў Эўрапейскага Зьвязу”, “Як сьмяецца Эўропа”, “Вечар эўрапейскай паэзіі”*)
- Дні беларуска-… культурных сувязяў, круглыя сталы, спраўныя гульні, прысвечаныя розным асьпектам вывучэньня Эўропы (*спраўныя гульні “Паседжаньне Парлямэнту Вялікабрытаніі”, “Школьны Эўрапарлямэнт”*)

- Эўрапейскі дзень у школе (на выбар кожная краіна, што ўваходзіць у Эўразьвяз, альбо 5 ці 9 траўня – Дзень Эўропы) (*“Дзень Францыі”, “Запрашаем у Іспанію”, “Грэцыя ўчора й сёньня”*)
- Віктарыны, прысвечаныя Эўразьвязу (*“Што ты ведаеш пра Эўразьвяз?”*)
- Эўраалімпіяды (*“Гісторыя ЭЗ. Інстытуты ўлады. Сьцягі краінаў ЭЗ. Краіны – помнікі культуры. Разьмяшчэньне краінаў ЭЗ на палітычнай мапе”*)
- Конкурсы перакладнікаў (з эўрапейскіх моваў на беларускую)
- Дэбаты, дыскусіі, лекцыі ў розных аспэктах эўрапейскай інтэграцыі (у галіне эканомікі, замежнай палітыкі, палітыцы бясьпекі) (*Дэбаты “Я й дэмакратыя”)*
- Выданьне школьнай газеты “Навіны Эўраклюбу”
- Міжнародны вучнёўскі клюб калекцыянэраў
- Арганізацыя школьнага рэфэрэндуму (напрыклад, у пытаньні далучэньня Беларусі да Эўразьвязу”

## 2. Эўрапейскі дзень у школе

Прыкладная праграма Эўрапейскага дня:

- Паказ эўрапейскіх фільмаў
- Конкурс “Эўразьвяз”
- Выстава зь інфармацыяй аб краінах-чальцах ЭЗ і функцыянаваньні ЭЗ
- Дыскусія з запрошанымі гасьцямі “Шлях Беларусі: Інтэграцыя з Эўропай ці Расеяй?”
- Выступ школьнага тэатру
- Выставы працаў (напрыклад пераможцаў “Эўрапейскага конкурсу” ў школе)
- Гатаваньне й дэгустацыя страваў розных краінаў

## 3. Анкета “Быць эўрапейцам”

*Інструкцыя*

1. Вызначце, каго вы жадаеце апытаць: усіх вучняў вашай школы ці толькі выбраныя клясы.
2. Падлічыце, колькі вам спатрэбіцца экзэмпляраў анкетаў і памножце іх на ксэраксе.
3. Памятайце, што анкеты мусяць быць АНАНІМНЫЯ й удзел у анкетаваньні – ДАБРАХВОТНЫ.
4. Праінфармуйце дырэкцыю школы пра анкетаваньне.
5. Падсумуйце вынікі.
6. Вынесіце вынікі на форум школы ці хаця б мінімальна праінфармуйце пра іх удзельнікаў анкетаваньня. Абвешчаньне вынікаў можа стаць часткай Дня Эўропы ў вашай школе ці іншай падобнай імпрэзы.

1. Акрэсьліце вашае стаўленьне да іншых народаў (ня толькі эўрапейскіх) на шкале ад –3 (максымальная непрымальнасьць) да +3 (максымальная сімпатыя).

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Амэрыканцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Ангельцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Баўгары | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Габрэі | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Італьянцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Кітайцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Латышы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Літоўцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Немцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Палякі | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Расейцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Сербы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Славакі | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Украінцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Французы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Харваты | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Цыганы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Чэхі | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Швэды | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Эстонцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |
| Японцы | ☐-3 | ☐-2 | ☐-1 | ☐0 | ☐1 | ☐2 | ☐3 |

2. У табліцы пазначце рысы, якія, на вашу думку, можна прыпісаць беларусам і іншым эўрапейцам.

| **Рысы** | **Беларусы** | **Іншыя эўрапейцы** |
|---|---|---|
| Зычлівасьць | | |
| Адкрытасьць для іншых | | |
| Патрыятызм | | |
| Адукаванасьць | | |
| Рэлігійнасьць | | |
| Уменьне знаходзіць выйсьце з сытуацыі (прадпрымальнасьць) | | |

| | | |
|---|---|---|
| Упэўненасьць у сабе | | |
| Ашчаднасьць | | |
| Паважлівасьць | | |
| Сьціпласьць | | |
| Пашана да працы | | |
| Іншае (упішы якія) | | |

3. Наколькі важныя напісаныя ніжэй рысы або як убачыць сапраўднага беларуса? Пазнач крыжыкам адпаведную рубрыку.

| **Рысы** | **Вельмі істотна** | **Істотна** | **Неістотна** |
|---|---|---|---|
| Быць народжаным у Беларусі | | | |
| Жыць у Беларусі доўгі час | | | |
| Размаўляць па-беларуску | | | |
| Мець аднаго з бацькоў – беларуса | | | |
| Адчуваць сябе беларусам | | | |
| Іншае: | | | |

## 4. Інтэграцыйныя й навучальныя сэмінары

Сэмінар – ня толькі самая эфэктыўныая форма грамадзянскай адукацыі, але й выдатны сродак для знаёмства ды інтэграцыі сяброў школьнага клюбу. Сэрыя сэмінараў-трэнінгаў дазваляе праз супольную дзейнасьць сфармаваць каманду, якая надалей будзе самастойна арганізоўваць акцыі школьнага эўрапейскага клюбу.

Прапануем мэтадычную распрацоўку двух аднадзённых міні-сэмінараў для старэйшых школьнікаў.

## 4.1. Сэмінар для падлеткаў “Я й сучасны сьвет”

**Мэта:** Разьвіцьце грамадзкіх і сацыяльных кампэтэнцыяў школьнікаў, шчыльнейшае знаёмства ўдзельнікаў Школьнага Эўрапейскага Клюбу, стварэньне атмасфэры супрацы ў клюбе.

Сэмінар разьлічаны на адзін дзень (чатыры сэсіі). Гэта прыкладна 6 гадзінаў зь перапынкамі на каву/гарбату й абед. Сэмінар пасуе як для зьяднаных групаў (асобных клясаў), так і для часова створаных групаў (у летніках).

### I сэсія

**Мэты:** Знаёмства, разьняволеньне, стварэньне добразычлівай атмасфэры.

### Практыкаваньне “Рамонак” (“Сонейка”)

Называньне сябе. Узгадваньне прыемнай падзеі тыдня.

### Гульня “Праўда й няпраўда”

Уяўленьне іншых пра мяне.

*Правядзеньне:*

Кожны ўдзельнік атрымлівае па дзьве невялікія паперкі, на якіх піша якасьці свайго характару. На адной зь іх праўдзівая, на другой – непраўдзівая якасьць. Затым гэтыя паперкі замацоўваюцца на плячах удзельнікаў. Група хаатычна рухаецца па памяшканьні й мусіць паставіць крыжыкі на тых паперках, дзе якасьць здаецца праўдзівай. Пасьля агучваецца (на жаданьне), ці здагадаліся ўдзельнікі аб праўдзівасьці альбо непраўдзівасьці пазначаных якасьцяў.

### Практыкаваньне “Квадрат з завязанымі вачыма”

Выпрацоўка правілаў узаемавыгоднай камунікацыі. Падрыхтоўка да групавой працы.

*Неабходныя матэрыялы:*

Вяроўка даўжынёй 8-10 мэтраў, зьвязаная абодвума канцамі, каб утварыць замкнёнае кола. Павязкі на вочы для 9-15 удзельнікаў.

*Апісаньне:*

1. Пакласьці вяроўку на падлогу так, каб яна ўтварыла прыблізнае кола. Папрасіць сямёра ці больш дабрахвотнікаў стаць на аднолькавай адлегласьці адзін ад аднога наўкол вераўчанага кола. Завязаць усім вочы й даць кожнаму вяроўку, каб трымаўся за яе абедзьвюма рукамі, выстаўленымі наперад.

2. Даць распараджэньне: вашая задача – утварыць правільны квадрат. Вы можаце размаўляць адзін з адным. Не дазваляецца адпускаць вяроўку. Калі вы адчуеце, што дамагліся мэты, акуратна пакладзіце вяроўку на падлогу, зьберагаючы форму, якой вы ёй надалі. Пасьля гэтага можаце зьняць з вачэй павязкі.

3. Пакуль група з завязанымі вачыма выконвае працу, парайце рэшце ўдзельнікаў: "Уважліва сачыце за працэсам і падумайце, чаму зь яго можна навучыцца".

*Абмеркаваньне:*

1. Што вы адчувалі, калі выконвалі працу?

2. А чаму навучыліся вы, пабочныя назіральнікі?

Звычайна бальшынь групаў ня просяць дапамогі ў назіральнікаў, якія ня маюць на вачах павязкі. А трэба ўразумець, што праца можа быць выкананая больш эфэктыўна, калі ў ёй возьме ўдзел і супольнасьць. (Разам мы можам зрабіць працу нашмат лепш.)

**II сэсія**

**Мэты:** Фармаваньне больш дакладных ведаў пра сябе.

**Практыкаваньне "Скажыце, што вы любіце?"**

*Апісаньне:*

а) Узгадайце штосьці, што ў вас добра атрымліваецца (хаця й не стасуецца да школы) і што вы заўсёды робіце з задавальненьнем. Выберыце які-небудзь занятак, запішыце.

б) Узгадайце, як вы прыйшлі да гэтага занятку. Навучыліся спэцыяльна альбо ўсё выйшла само па сабе? Магчыма, вы назіралі, як гэта робяць іншыя людзі, альбо чыталі кнігі? Напішыце пра гэта некалькі радкоў.

в) Што, па-вашаму, дапамагло вам дасягнуць посьпехаў? Якая матывацыя была ў вас? Хто-небудзь дапамагаў вам, падтрымліваў вас? Чаму вы гэтым займаліся?

г) Ці змаглі б вы навучыць сваёй любімай справе іншых? Калі так, то якім чынам? Калі не – чаму? Адкажыце некалькімі фразамі.

Удзельнікі разьбіваюцца на некалькі групаў па 3–5 чалавек, каб распавесьці, што яны запісалі. Затым усе сядаюць у агульнае кола. Абмеркаваньне пытаньня: “Як і чаму мы, нягледзячы на калясальную нагрузку ў школе, усё роўна навучаемся нечаму самі й цікавімся чымсьці іншым?” (Ці тыя заняткі, якія пазначалі ўдзельнікі, выкладаюцца ў школе?)

**Практыкаваньне “Чаму мяне навучае...”**

*Апісаньне:*

Удзельнікі разьбіваюцца на чатыры групы. Кожнай з групаў прапануецца адно з чатырох пытаньняў: Чаму мяне навучае школа? Чаму мяне навучаюць бацькі? Чаму мяне навучаюць сябры? Чаму я навучаюся сам? Мазґавы штурм у групах. Прэзэнтацыя. Абмеркаваньне ў агульным коле.

**Практыкаваньне “Аўтапартрэт”**

*Неабходныя матэрыялы:* Кожнаму ўдзельніку патрэбныя асадка альбо аловак і чысты аркуш паперы.

*Апісаньне:*

1. Прапануйце ўдзельнікам паставіць аловак альбо асадку ў цэнтар чыстага аркушу паперы. Патлумачце, што яны зараз будуць маляваць аўтапартрэт у поўны рост. На месцы, дзе зараз стаіць аловак, будзе пупок. Вашае заданьне ў тым, каб дапамагчы ўдзельнікам намаляваць аўтапартрэт згодна з вашымі ўказаньнямі. Яны мусяць маляваць тыя часткі цела, якія вы скажаце, ня гледзячы на малюнак, пакуль партрэт ня будзе скончаны. Яны могуць адрываць аловак альбо асадку ад паперы, але не павінны глядзець на тое, што малююць.

2. Пасьля гэтага ўдзельнікі малююць аўтапартрэт згодна з вашымі ўказаньнямі. Пры гэтым парадак маляваньня мусіць быць даволі складаны: пазначаць часткі цела, якія знаходзяцца даволі далёка адно ад аднога (напрыклад, твар, левая рука, правая нага, валасы, тулава, левая нага й г.д.) і так, пакуль усе часткі цела ня будуць намаляваныя.

3. Цяпер прапануйце ўдзельнікам паглядзець на свой малюнак і на малюнкі іншых.

*Абмеркаваньне:*

Прапануйце ўдзельнікам патлумачыць, зь якімі цяжкасьцямі ім давялося сустрэцца, малюючы свой партрэт. “Як вы адчуваеце, калі вамі кіруюць?” Як правіла, удзельнікі адзначаюць такі момант, як

неабходнасьць выконваць указаньні фасылітатара, замест таго каб працаваць згодна са сваімі ўяўленьнямі пра неабходны парадак дзеяньняў. Неабходнасьць маляваць розныя часткі цела без усялякай сыстэмы замест таго, каб маляваць іх у лягічнай пасьлядоўнасьці; немагчымасьць убачыць вынікі сваіх дзеяньняў (немагчымасьць зьверыць вынікі з уласным бачаньнем аўтапартрэту). “Як гэта можна параўнаць з жыцьцём?” Як уплывае на жыцьцёвы посьпех актыўная ўласная пазыцыя?”

## III сэсія

**Мэты:** Усьведамленьне сябе як асобы й сябе як часткі каманды.

### Практыкаваньне “Малюнак у парах”

*Неабходныя матэрыялы:*

Кожнаму ўдзельніку аловак і папера. Выявы пяці фігураў: трыкутнік, квадрат, кола, пяціканцовая й шасьціканцовая зоркі.

*Апісаньне:*

Група разьбіваецца на пары, якія сядаюць на крэслы сьпінамі адзін да аднога. А – першы нумар у пары, Б – другі.

1 этап: А й Б ствараюць кампазыцыю з прапанаваных пяці фігураў, час 3 хв.

Затым А – кажа, як маляваць, Б – ілюструе кампазыцыю, якую намаляваў А, пры гэтым Б маўчыць, а А тлумачыць, як маляваць. Пасьля наадварот: А малюе тое, што намаляваў Б, а Б тлумачыць. Праца сканчаецца, малюнкі параўноўваюцца.

2 этап: Абодва ўдзельнікі малююць кампазыцыі зь фігурамі, затым па чарзе адзін пытаецца, як маляваць, а іншы можа адказваць толькі “так” ці “не”. Малюнкі параўноўваюцца.

3 этап: Абодва ўдзельнікі малююць кампазыцыі, выкарыстоўвачы прапанаваныя фігуры. Затым А й Б ілюструюць малюнкі адзін аднога з дапамогай вольных зносінаў.

Пасьля кожнага раўнду група адказвае на пытаньне, што дапамагло намаляваць кампазыцыю, якую прапанаваў напарнік.

### Практыкаваньне “Што мусіць ведаць кожны?”

Сьпіс пытаньняў. Праца ў парах і тройках.

*Неабходныя папярэднія тэзы:*

Паводле футуролягаў (футуралёгія – навука пра будучыню), аб’ём чалавечых ведаў падвоіўся за пэрыяд з 1700 па 1900 год, потым яшчэ раз падвоіўся паміж 1900 і 1950 і яшчэ раз падвоіўся ў 1950-1970 гг. Зараз ён падвойваецца што пяць год. Калі тэмпы росту захаваюцца, то неўзабаве колькасьць інфармацыі, якая ёсьць у сьвеце, пачне падвойвацца кожныя 73 дні! Адсюль узьнікаюць пытаньні: Што менавіта зь бясконцых плыняў разнароднай інфармацыі мусіць ведаць кожны?

*Апісаньне:*

Уявіце сабе сытуацыю, што ўсе навучальныя пляны, праграмы, усе школьныя падручнікі нечакана зьніклі. Іншымі словамі, горы навучальных матэрыялаў умомант перасталі існаваць. Цяпер уявіце, што вы вырашылі гэтую сытуацыю выправіць і вам патрэбна скласьці навучальную праграму. Праграма павінна быць цікавая ня толькі для вас, але й для іншых. Можаце выбіраць любыя прадметы, тэмы й пытаньні, якія лічыце неабходнымі. Няма абмежаваньняў у выбары. Гэта тое, што, на ваш погляд, патрэбна ведаць і ўмець сучаснаму маладому чалавеку, каб дасягнуць посьпеху ў жыцьці.

I этап. Група падзяляецца на тройкі й складае свае праграмы. Пасьля прэзэнтуе ўласныя напрацоўкі.

II этап. Інвэнтарызацыя праграмаў. Складаньне агульнае праграмы. Прадметы, тэмы, уменьні, навыкі раскладаюцца на дзьве групы: “важна” (валізка) – “ня вельмі важна” (мясасечка). Звычайна выкарыстоўваецца яшчэ “сьметніца”, але ў гэтым практыкаваньні ёсьць умова нічога не адкідваць.

## IV сэсія

**Мэта:** Навучыць прэзэнтаваць вынікі сваёй працы.

### Каляж “Ідэальны малады чалавек”

Стварэньне каляжу дазваляе ўлучыць у працу ўсіх удзельнікаў. Малюнкі трэба адшукаць, выразаць, а пасьля згрупаваць атрыманы матэрыял. У працэсе стварэньня кіруюцца найперш выяваю, варыянты й зьмены магчымыя на кожным этапе канструяваньня каляжу. Удзельнікі вучацца гэткім чынам выяўляць і рэалізоўваць ня толькі свае настроі й пачуцьці, але й думкі й выказваньні.

*Неабходныя матэрыялы*:

Старыя газэты, часопісы, каляровая папера, папера вялікая фармату А1 (ватман), клей, нажніцы.

*Апісаньне:*

Сфармаваць невялікія групы (максымум 5 чалавек). Лепш, каб было 3–4 малыя групы. Неабходна зьвярнуць увагу, каб “мадэль” была ўхваленая ўсімі ўдзельнікамі малой групы й з дапамогай розных стылёвых сродкаў адказвала на тры пытаньні:

· “Што ідэальны малады чалавек мае ў сваёй галаве?” (Ягоныя веды);

· “Што ён мае на сэрцы?” (Ягоныя пачуцьці);

· “Што ў яго ў руках?” (Ягоныя ўменьні).

*Прэзэнтацыя й абмеркаваньне:*

Увага засяроджваецца на выказваньнях і сродках іх выяўленьня.

Ці цяжка было прыйсьці да ўзгадненьня “мадэлі”?

Як адбывалася ўзгадненьне?

Ці ўсе бралі ўдзел у працы?

Пасьля – разважаньні над пытаньнямі (індывідуальная праца, якая не выносіцца на агульнае абмеркаваньне):

· Ці падобны я да “ідэальнай мадэлі”?

· Чаго ў мяне бракуе?

· Што я маю зрабіць, каб дасягнуць “ідэалу”.

**Практыкаваньне на разьвітаньне “Каляровая вяровачка”**

*Неабходныя матэрыялы:* клубок каляровых нітак.

Група становіцца ў кола. Вядоўца, трымаючы ў руках каляровы клубок, прапануе кожнаму з удзельнікаў перадаць каму-небудзь клубок і пры гэтым абавязкова зь нейкімі добрымі пажаданьнямі. Такім чынам атрымліваецца нешта накшталт павучыньня. Пасьля таго як клубок вяртаецца да вядоўцы, ён разразае ніткі такім чынам, каб у кожнага ўдзельніка застаўся кавалачак каляровай ніткі.

Некаторыя спосабы падзелу на групы:

- Адлічваньне
- “Puzzle” – разрэзаныя паштоўкі
- Нумары на крэслах
- Гульня “Кіс-мяў”
- Post-it рознага колеру на сьпіны ўдзельнікаў. Моўчкі сабрацца ў групы

Гульні, якія могуць выкарыстоўвацца на пачатку кожнай сэсіі (Апісаньні гульняў і энэргізатараў можна знайсьці ў кнізе *Копилка игр / сост. И. Губаревич. – Мн.: СПОО “Чазения”, 2002*):

- “Жыхары. Дамкі. Землятрус”
- “Заапарк”
- “Тры крэслы”
- “Мяняюцца месцамі тыя, хто...”
- “Пашыхтавацца па...”
- “Дакрануцца да...”
- “Вандроўка”
- “Белая й чорная магія”
- “Нажніцы” (варыянт: “Сьвечка”)

## 4.2. Сэмінар-трэнінг “Што такое дэмакратыя?”

**Мэты:** Даць падставовыя веды пра дэмакратыю, стварыць умовы для выпрацаваньня дэмакратычных нормаў, кампэтэнцыяў: умець дамаўляцца, працаваць у камандзе, улічваць меркаваньне, вырашаць канфлікты, адстойваць сваё гледзішча.

Сэмінар разьлічаны на чатыры акадэмічныя гадзіны.

**Хада сэмінару**

**Частка 1**

**Уступ (уводзіны ў тэму)**

Дэмакратыя –падмурак усёй эўрапейскай цывілізацыі. Гэта асноўны прынцып і асноўная ўмова далучэньня да эўрапейскай супольнасьці. Дэмакратычная будова грамадзтва – асноўная ўмова для краіны, якая мае намер стаць сабрам Эўрапейскага Зьвязу. Каб сыстэматызаваць і ўдасканаліць веды пра дэмакратыю, праводзіцца гэты сэмінар.

Пачаць сэмінар прапануецца зь невялікай дыскусіі. Для яе правядзеньня добра пасуе мэтад “4 куты”.

Удзельнікам сэмінару прапануецца адказаць на пытаньні паводле вызначанага альгарытму. Вядоўца задае пытаньне, якое мае 4 варыянты адказаў. Прычым кожны з варыянтаў адпавядае таблічцы, якая ёсьць у адным з 4-х кутоў памяшканьня. Для ўводзінаў у тэму “Што такое дэмакратыя?” пытаньне можа быць наступным:

“Самай эфэктыўнай формай кіраваньня ёсьць: абсалютная манархія, дэмакратыя, анархія, дыктатура?”

Удзельнікі выбіраюць адзін з 4-х адказаў на пытаньне й перамяшчаюцца ў адпаведны кут. Далей у кожнай групе ідзе абмеркаваньне адказаў на пытаньне: “Чаму я выбраў гэты варыянт адказу?” і прэзэнтацыя адказу. Астатнія групы могуць задаваць пытаньні пасьля кожнай прэзэнтацыі.

Заўвага: задача вядоўцы – вытрымліваць фармат “пытаньне – адказ”, каб не ператварыць дыскусію ў спрэчку.

**Частка 2**

**Ролевая гульня**

Удзельнікі дзеляцца на 2 групы. 1-я група атрымлівае каляровыя наклейкі “аўтсайдэры” й выдаляецца ў іншы пакой. Другая група – “інсайдэры”. Яны павінныя прыдумаць правілы паводзінаў для сваёй групы й “аўтсайдэраў”. Такіх правілаў можа быць каля пяці. Прыкладам могуць быць наступныя правілы:

1. Аўтсайдэрам нельга выходзіць за межы кола, абведзенага крэйдай на падлозе, дакуль ім дазволяць.

2. Аўтсайдэрам нельга сядзець, калі інсайдэры стаяць.

3. Аўтсайдэрам нельга размаўляць, пакуль да іх ня зьвернуцца інсайдэры.

4. Аўтсайдэрам нельга глядзець на інсайдэраў, толькі ў падлогу.

5. Аўтсайдэры павінны выконваць усе загады інсайдэраў.

Прыдуманыя правілы запісваюцца на вялікім аркушы паперы й вывешваюцца на дошцы.

Затым запрашаюцца інсайдэры, якім паведамляецца, што яны павінны выконваць прынятыя правілы. Праз 5–7 хвілінаў гульня спыняецца. Групы мяняюцца месцамі.

Пасьля заканчэньня гульні пэдагог абмяркоўвае гульню з вучнямі. Пытаньні для абмеркаваньня могуь быць наступныя:

1. Што вы адчувалі, калі былі аўтсайдэрамі? Што было самым непрыемным?

2. Якія прывілеі мелі інсайдэры? А абмежаваньні?

3. Ці былі правілы гульні справядлівыя? Чаму?

4. Якім чынам можна было выправіць сытуацыю? (Ці былі б правілы такімі, каб у іх выпрацоўцы бралі ўдзел дзьве групы?)

5. Як вы лічыце, што можа адбыцца ў краіне, дзе ёсьць падобныя аўтсайдэры?

Вядоўца (пэдагог) падводзіць вучняў да высновы, што дэмакратыя – гэта й ёсьць такі спосаб кіраваньня краінай, калі выпрацаваньне агульных нормаў адбываецца з улікам меркаваньня ўсіх групаў грамадзтва.

**Частка 3**

**Выпрацаваньне законаў. Практыкаваньне "Выспа".**

Уступнае слова вядоўцы:

Уявіце, што сьвеціць сонца, навокал цёплыя марскія хвалі. Мы плывем на караблі. Карабель вельмі вялікі. На караблі плывуць людзі розных расаў, рэлігіяў і нацыянальнасьцяў. Сярод пасажыраў ёсьць бедныя й багатыя, дарослыя й дзеці, мужчыны й жанчыны.

Раптам наляцела бура, падняла вялікія хвалі, і наш карабель патануў. Але ўсе пасажыры выратаваліся, бо побач была выспа. На ёй была пітная вада й ежа. Але выспа ляжыць далёка ад марскіх шляхоў, таму невядома, колькі нам на ёй давядзецца жыць: некалькі дзён або ўсё жыцьцё.

Зараз за 15 хвілінаў кожная група павінна выпрацаваць 5 законаў сваёй выспы.

Падчас прэзэнтацыі законаў да кожнай групы вядоўца задае пытаньні:

– Як можна назваць форму кіраваньня вашаю выспаю?

– Ці лёгка было выпрацаваць законы?

**Частка 4**

**Што ж такое дэмакратыя? Практыкаваньне "5 з 25".**

Вядоўца раздае матэрыялы "25 рысаў сапраўднай дэмакратыі" (*Гл. дадатак 1*).

Кожны ўдзельнік індывідуальна павінен выбраць 5 рысаў з 25, якія ён (яна) лічыць найважнейшымі.

Пры падсумаваньні вядоўца распавядае, што існуюць розныя мадэлі дэмакратыі, і прапануе 5 рысаў, прысутныя ў кожнай з гэтых мадэляў.

У коле разам абмяркоўваюцца гэтыя рысы.

*№ 1.* Сувэрэннасьць асобы й чалавечых супольнасьцяў (сям'я, мясцовае насельніцтва, народ). (Крыніца ўлады – асоба. Адрозна ад манархіі, дзе ўлада ад нараджэньня ("ад Бога").)

*№ 4.* Улада базуецца на падтрымцы грамадзянаў (свабодныя, усеагульныя й роўныя выбары). (Мэханізм дэлегаваньня ўлады – выбары.)

*№ 7.* Улада бальшыні, якая шануе правы меншыні. (Гэтая рыса вельмі важная. Калі не захоўваецца павага да меншыні, дэмакратыя перастае існаваць.)

№ 16. Канстытуцыйнае абмежаваньне кантраляванай улады, падзел улады. (Незалежнасьць заканадаўчай, выканаўчай і судовай уладаў.)

№ 22. Арганізацыя грамадзтва й скіраванасьць людзей на супрацоўніцтва ды пошук магчымасьцяў паразуменьня й кампрамісу.

**Частка 5**

**Абараняем дэмакратыю**

Вядоўца прапануе 4 выказваньні не на карысьць дэмакратыі, якія трэба адпрэчыць альбо пацьвердзіць. Удзельнікі выказваюць аргумэнты, пакуль ня знойдуць вельмі моцны, які адпрэчвае прапанаванае вядоўцам выказваньне.

А) Дэмакратыя – вельмі кепская форма праўленьня, бо ў выніку выбараў можа прыйсьці да ўлады некампэтэнтны, не адпаведны пасадзе чалавек. (Напрыклад, гэтае выказваньне можна адпрэчыць наступным аргумэнтам: "Некампэтэнтны чалавек можа прыйсьці да ўлады, але толькі дэмакратыя мае мэханізм яго пераабраньня".)

Б) Пры дэмакратыі голас бадзягі ці прыбіральшчыцы мае такую ж вагу, як і голас прафэсара.

В) Дэмакратыя прадугледжвае абмежаваны тэрмін кіраваньня – можна не пасьпець зрабіць нічога важнага.

Г) Дэмакратычныя працэдуры займаюць вельмі шмат часу для абмеркаваньня й прыняцьця рашэньняў.

Як лягічнае падсумаваньне, можна абмеркаваць выказваньне Ўінстана Чэрчыля: “Дэмакратыя – не ідэальная форма праўленьня, але найлепшая з усіх формаў, знойдзеных чалавекам”.

*Дадатак 1*

## Асноўныя рысы сапраўднай дэмакратыі*

1. Сувэрэннасьць асобы й чалавечых супольнасьцяў (сям’я, мясцовае насельніцтва, народ).
2. Кожны грамадзянін мае шанц рэальна ўплываць на ўрад сваёй краіны.
3. Кантраляваньне чыноўнікаў, якія прымаюць рашэньні ў справах людзей, асаблівы грамадзкі кантроль над сілавымі інстытутамі (войска, паліцыя).
4. Улада базуецца на падтрымцы грамадзянаў (свабодныя, усеагульныя й роўныя выбары).
5. Галоснасьць публічных справаў, асабліва фінансавай палітыкі дзяржавы, ды дзейнасьці дэмакратычна створаных структураў.
6. Грамадзкая салідарнасьць з убогімі й пакрыўджанымі лёсам.
7. Улада бальшыні, якая шануе правы меншыні.
8. Свабода сродкаў масавай інфармацыі, дасягальнасьць мэдыяў для ўсіх грамадзкіх супольнасьцяў.
9. Існаваньне на кожным роўні ўлады, неабходнай для агульнай карысьці.
10. Высокі ровень ведаў грамадзянаў пра палітычныя, эканамічныя й сацыяльныя праблемы, жаданьне й уменьне браць удзел у грамадзкім жыцьці.
11. Гарантыя правоў чалавека й сям’і.
12. Дзейнасьць палітычных партыяў для рэалізацыі волі грамадзянаў.
13. Роўнасьць перад законам, справядлівы судовы працэс у незалежным судзе.
14. Існаваньне грамадзкіх аўтарытэтаў на роўні дзяржавы, народу, рэгіёну й сям’і, і разам з тым свабода шырокай дыскусіі на любую тэму.
15. Шанаваньне чалавечага жыцьця й здароўя, якое праяўляецца ў заканадаўстве й рашэньнях уладаў усіх роўняў.
16. Канстытуцыйнае абмежаваньне кантраляванай улады, падзел улады.
17. Доступ грамадзянаў да прадстаўнікоў улады кожнага роўню.
18. Свабоднае функцыянаваньне недзяржаўных арганізацыяў.
19. Сыстэма каштоўнасьцяў, угрунтаваная на талерантнасьці: чалавек важнейшы за ягоныя погляды.
20. Магчымасьць у межах закону супрацьстаяць актуальнай уладзе.
21. Абмежаваньне дзяржаўных структураў да неабходнага мінімуму.

* Пры падрыхтоўцы гэтага дадатку былі скарыстаныя матэрыялы Фундацыі “Адукацыя для дэмакратыі”.

22. Арганізацыя грамадзтва й пастава людзей на супрацоўніцтва й пошук магчымасьцяў паразуменьня й кампрамісу.

23. Абавязак жыхароў клапаціцца пра сваё асяродзьдзе й арганізоўваць яго для агульнага дабра.

24. Непрыняцьце любых формаў расізму й дыскрымінацыі.

25. Дзяржава гарантуе грамадзянам свабоду дзеяньня й пачуцьцё бясьпекі ў сфэры індывідуальнай свабоды й права на ўласнасьць.

## 5. Школьны дыскусійны клюб

### Мэта школьнага дыскусійнага клюбу:

Стварэньне навучальнага асяродку для моладзі, дзе яна магла б атрымаць ня толькі веды, але неабходныя для дарослага жыцьця кампэтэнцыі: фармуляваць і адстойваць сваё гледзішча, слухаць аргумэнты іншых, цывілізавана й бесканфліктна весьці дыскусію.

Ідэя дыскусійнага клюбу вельмі простая. Калі два чалавекі маюць па яблыку ды абмяняюцца імі – у кожнага застанецца па аднаму яблыку. Але калі гэтыя ж людзі маюць па адной ідэі ды абмяняюцца імі, то кожны будзе мець па дзьве ідэі.

Прыкладна такую абвестку *(мал.1)* можна разьмясьціць на школьнай дошцы абвестак. У нашым выпадку да гэтай абвесткі штотыдзень дадавалася афіша *(мал.2)*, дзе абвяшчалася тэма наступнай дыскусіі. На працягу году (зь перапынкамі на канікулы) гэтыя абвесткі зьбіралі ў дыскусійным клюбе ад 7 да 45 удзельнікаў.

*Малюнак 1*

*Абвестка школьнага Дыскусійнага клюбу*




*ДЗЕ?!*

*Малюнак 2*

*Афіша Моладзевага дыскусійнага клюбу*




## 5.1. Як заснаваць школьны дыскусійны клюб

*1. Падрыхтоўчы этап.*

Для падрыхтоўкі першага паседжаньня клюбу патрэбна правесьці нараду ініцыятыўнай групы.

На гэтай нарадзе:

– Зацьвердзіць тэму;

– Вызначыць адказных за падрыхтоўку паседжаньня;

– Запрасіць экспэртаў (экспэртамі могуць быць запрошаныя спэцыялісты альбо вучні, якія загадзя вывучалі тэму дыскусіі);

– Прадумаць форму правядзеньня першай дыскусіі;

– Праінструктаваць вядоўцу.

Арганізацыйныя пытаньні надалей можна вырашаць напрыканцы кожнага паседжаньня. Вельмі важна, каб самі ўдзельнікі вызначалі тэмы, якія іх цікавяць, і бралі на сябе адказнасьць за падрыхтоўку й вядзеньне клюбу.

*2. Выпрацоўка правілаў дыскусіі.*

Пажадана гэтыя правілы выпрацаваць разам з удзельнікамі на адным зь першых паседжаньняў. Правілы прымаюцца кансэнсусам. Вядоўца павінен нагадаць удзельнікам, што гэтыя правілы будуць дзейнічаць толькі падчас паседжаньня клюбу. Вядоўца павінен прасачыць, каб выпрацаваныя правілы датычылі працэдуры, а не асабовых якасьцяў ці псыхалягічнага стану ўдзельнікаў.

Прыкладам, сярод правілаў могуць быць:

– *Слухаць і чуць;*

– *Не перапыняць;*

– *Выказвацца ад сябе;*

– *Адзін чалавек прамаўляе ня больш за 3 хвіліны;*

– *Дазваляецца крытыкаваць думку, а не асобу.*

Але ня могуць быць:

– *актыўна ўдзельнічаць;*

– *мець добры настрой;*

– *ня крыўдзіцца* й г.д. Проста таму, што гэта ад удзельнікаў не залежыць.

На наступных паседжаньнях можна нагадаць нормы, выпрацаваныя раней для арганізацыі сумеснай працы, дадаць пры неабходнасьці новыя.

Эфэктыўнасьць дыскусіі залежыць ад актуальнасьці й яснай фармулёўкі пытаньня, яснай пастаноўкі, што й навошта абмяркоўваецца. Пры фармуляваньні праблемы й мэты дыскусіі прадугледжваецца наяўнасьць агульных ведаў і пэўных разыходжаньняў у гэтых ведах у вучняў, валоданьне агульнымі тэрмінамі, паняцьцямі на тэму дыскусіі.

*Карысная інфармацыя для вядоўцы.*

Мэты дыскусіі звычайна шчыльна зьвязаныя зь яе тэмай. Шырока сфармуляваная тэма прадугледжвае збор і ўпарадкаваньне інфармацыі, пошук альтэрнатываў, інтэрпрэтацыю аргумэнтаў, прыкладаў. Вузка сфармуляваная тэма сканчаецца звычайна прыняцьцём групавога рашэньня ў абмяркоўваных пытаньнях. Такім чынам, дыскусія можа быць накіраваная на:

- абдумваньне й разгляд пытаньняў з розных бакоў, крытычнае стаўленьне да аднаго й таго ж прадмету, зьявы, сытуацыі;
- пошук кампрамісных рашэньняў праблемы, канструяваньне новых ведаў;

- зьмену ўстановак;
- стымуляваньне творчасьці;
- фармаваньне камунікацыйных уменьняў і навыкаў вядзеньня дыскусіі.

Вядоўца знаёміць удзельнікаў з альгарытмам правядзеньня дыскусіі, разьмяркоўвае пры патрэбе ролі.

На гэтым этапе неабходна арганізаваць з дапамогай пытаньняў і адказаў дапасаваньне ў паняцьцях і тэрмінах сярод навучэнцаў, бо гэта найважнейшая ўмова ўзаемаразуменьня ў працэсе абмеркаваньня, якая будзе садзейнічаць глыбокаму й зьмястоўнаму разгляду праблемы. У адваротным выпадку дыскусія можа пераўтварыцца ў непатрэбную спрэчку, дзе час будзе патрачаны на ўдакладненьне пазыцыяў кожнага з удзельнікаў.

Абавязковай умовай зьмястоўнай дыскусіі ёсьць устаноўка вядоўцы на супрацу, якую разумеюць як яснасьць і канкрэтнасьць аргумэнтаў, дакладнасьць тэрмінаў і азначэньняў, падтрымку сяброўскай атмасфэры, з аднаго боку, а з другога – аўтаномнасьць кожнага ўдзельніка абмеркаваньня, іх уменьне выслухаць да канца, крытычна ставіцца да тэзаў апанэнта й жаданьне выказваць сваё гледзішча.

## 5.2. Мэтадычныя распрацоўкі тэматычных паседжаньняў Моладзевага дыскусійнага клюбу Менску.

### Тэма 1: Зьехаць ці застацца? – праблема моладзевай эміграцыі

На сьценцы каля ўваходу вывешваюцца 2 аркушы паперы й кладуцца маркеры.

*Мэта:* вызначэньне тэмаў для наступных сустрэчаў і выяўленьне чаканьняў.

Два аркушы фармату А3–А1, з пытаньнямі:

– “Мне б хацелася, каб у Дыскусійным клюбе”...

– “Мне б не хацелася, каб у Дыскусійным клюбе”...

На наступных сустрэчах гэтыя аркушы могуць мець крыху іншыя загалоўкі:

“Мае прапановы й заўвагі”

“Прапаную тэму”

*Уступ*

Вітаньні, знаёмства праводзяцца ў выглядзе гульні “Фанты”. Вядоўца выцягвае пытаньне-фант з капэрты й пытаецца ў кожнага ўдзельніка па чарзе, каму яго задаць. Пасьля пытаньне агучваецца й усе слухаюць адказ.

*Пытаньні для інтэрактыўнай гульні:*

Ці Вам падабаецца вучыцца?

Нармальна жыць – што гэта значыць для мяне?

Ці беларуская моладзь можа дапамагчы Беларусі?

Ці Вы займаецеся спортам?

Што вы любіце есьці?

Ці Вы любіце рана падымацца?

Ці Вы граеце на музычных інструмэнтах?

Ці Вы бывалі за мяжой?

Што б Вы назвалі сваім імем?

Назавіце рысы тыповага беларуса.

Распавядзіце Ваш любімы анэкдот.

Што жадаеце свайму суседу зьлева?

Ваш любімы колер?

Ваша любімая жывёліна?

Ці Вы размаўляеце на замежных мовах?

Ці Вы чысьціце зубы штораніцы?

Ці Вы ўмееце плаваць?

Ці Вы ведаеце, што такое Дыскусійны клюб?

Каб я мог выбіраць, я б хацеў нарадзіцца ў .....( краіне)?

*Правілы Дыскусійнага клюбу:*

– выказвацца ад сябе (Я-выказваньне);

– не крытыкаваць асобу (але ня думку);

– не перапыняць, але захоўваць рэглямэнт;

– слухаць і чуць.

*Пытаньні для дыскусіі.*

**Пытаньне 1**. Якія пэрспэктывы ў Беларусі ў параўнаньні з краінай эміграцыі?

*Выступ экспэртаў.* Пажадана запрасіць экспэртаў, якія маюць асабісты досьвед працяглага жыцьця за мяжой падчас вучобы, працы па кантракце, інш.

**Пытаньне 2**. Прычыны эміграцыі моладзі. Зь якіх прычынаў вы б эмігравалі (або не эмігравалі) ў іншую краіну?

*Мэтад* – маўклівая дыскусія.

*Спосаб правядзеньня:*

1. Вядоўца тлумачыць, якім чынам будуць праходзіць дэбаты (гэта асабліва важна, калі дэбаты праводзяцца ўпершыню).

2. Вядоўца падзяляе ўдзельнікаў напалам, садзіць за сталы, выстаўленыя ў шэраг па абодва бакі клясы, і раздае ім аркушы паперы (А1), на якіх 2 розныя пазыцыі. "Я б эміграваў у іншую краіну, бо..." Я супраць эміграцыі, бо..."

3. Вучні, седзячы па абодва бакі, пачынаюць папарны пісьмовы дыялёг. Вучням з абедзьвюх групаў адводзіцца 5 хвілінаў для фармуляваньня адкрытых аргумэнтаў на карысьць пазыцыі, пазначанай на аркушы. Яны запісваюць іх ў форме старанна адрэдагаваных сказаў. У гэты час вучні другой групы рыхтуюцца аргумэнтаваць свой пункт погляду, які змогуць выкласьці падчас дэбатаў.

4. Затым аркушы пераходзяць да партнэраў супрацьлеглага лягеру "праціўнікам эміграцыі" адводзіцца 5 хвілінаў для фармуляваньня й запісу сваіх аргумэнтаў на карысьць эміграцыі, а "прыхільнікі" дадаюць аргумэнты супраць эміграцыі.

5. Працэдура абмену аргумэнтамі паўтараецца 2–3 разы. Звычайна дастаткова 3–4 раўндаў, каб вычарпаць моцныя аргумэнты. Пасьля гэтага працы зьбіраюцца.

6. Добрай формай падвядзеньня вынікаў у дэбатах ёсьць пытаньне, зьвернутае да абодвух бакоў: «Якія былі найлепшыя аргумэнты праціўніка»?

**Пытаньне 3**. Чаму эмігранты ў 3–4-м пакаленьні мараць вярнуцца на Радзіму?

Абмеркаваньне ў коле разам з экспэртамі.

**Пытаньне 4**. Што можна зрабіць у нашых умовах, каб палепшыць сытуацыю?

*Мэтад* – мазґавы штурм.

Тэхніка мазґавога штурму вельмі простая. Зьбіраецца група людзей, знаёміцца з праблемай, і кожны пасьля выказвае думкі, як яе вырашыць. Падчас мазґавога штурму ніхто не камэнтуе выказаных думак, не дае ім ацэнкі. Экспэрты сьцьвярджаюць, што мазгавы штурм можна лічыць удалым, калі пасьля адпаведнай аналітычнай апрацоўкі 5–6 ідэяў акажуцца патэнцыйным шляхам рашэньня праблемы.

*Спосаб правядзеньня.*

1. Вядоўца тлумачыць групе значэньне мазґавога штурму й наступныя прынцыпы:

- мэта – якасьць: чым болей ідэяў, тым лепш;
- дай волю фантазіі, не адкідай ідэі толькі таму, што яны не пасуюць да агульнапрынятых схемаў;
- будуй, абапіраючыся на ідэі іншых, хай яны натхняюць цябе;
- устрымайся ад ацэнак – для іх прыйдзе час.

2. Вядоўца дае сыгнал пачатку. Ён рэгіструе ідэі. Падчас акту творчага мысьленьня падтрымлівае нязмушаны парадак, запрашае ўсіх да дзейнага ўдзелу, сочыць, каб пэўныя асобы не падпарадкавалі сабе ходу дыскусіяў. Ён адразу рэагуе, калі прынцыпы парушаюцца. Акт працягваецца датуль, датуль новыя ідэі будуць біць шырокім струмянём. Калі струмень ператворыцца ў павольны цурок, вядоўца сканчае дэбаты.

3. Пасьля кароткага перапынку, неабходнага, каб удзельнікі змаглі пераключыцца з творчага на крытычнае мысьленьне, надыходзіць фаза ўпарадкаваньня ідэяў (сьпіс ідэяў можна перапісаць і раздаць удзельнікам). Затым, згрупаваўшы ідэі, удзельнікі па чарзе аналізуюць іх, выбіраючы й дэталізуючы тыя, якія пададуцца ім патэнцыйным рашэньнем праблемы.

*Карысная інфармацыя з тэмы.*

Рэгулярны прыплыў выхадцаў зь Беларусі ў заходнія краіны зазначыўся ў канцы 1980-х гадоў. З 1988 па 1999 гг. атрымалі дазвол на эміграцыю каля 143 тыс. чалавек. На 1999 г., паводле неафіцыйных зьвестак, каля 500 тыс. беларусаў жыло ў ЗША, каля 100 тыс. – у Канадзе, дзясяткі тысячаў у Аргентыне, Бразыліі, Францыі, Бэльгіі, Германіі, а таксама ў новых цэнтрах беларускае дыяспары – Вялікабрытаніі й Аўстраліі. Прыкладна 250–400 тыс. беларусаў Беласточчыны апынулася ў

Польшчы па вызначэньні пасьляваенных дзяржаўных межаў. Пасьля распаду СССР на ягоных былых абшарах апынулася бальшыня ўсіх замежных беларусаў: у Расеі іх больш за 1 млн. чалавек, ва Ўкраіне больш 400 тыс., Казахстане – 110 тыс., Латвіі – амаль 100 тыс., Літве – 55 тыс., Эстоніі – 25 тыс. і г. д. У Лацінскай Амэрыцы – 350 тыс. беларусаў.

На мяжы 20–21 стст. за межамі Беларусі жыве каля 3,5 мільёнаў беларусаў. Духоўнай асновай нацыянальнага самавызначэньня, праявай самабытнасьці, адметнасьці сталі створаныя ў замежжы працай і ахвярнасьцю многіх беларусаў грамадзкія, палітычныя, асветна-культурныя, навуковыя, рэлігійныя арганізацыі, суполкі мастакоў, нацыянальны друк і асьвета, культурныя цэнтры, музэі й архівы, мастацкія калектывы, пабудаваныя храмы.

Фармальна становішча цяпер значна больш спрыяльнае для беларусаў у замежжы, чым некалі, бо маем сваю дзяржаву, амбасады, прадстаўніцтвы, нас прызнаюць, з намі лічацца. Нічога такога ня мела эміграцыйная моладзь у 20-30-х, ці 40-х гадах. Чыноўнікі вызьвяраліся на слова "беларус". Прозьвішча нават не маглі запісаць у дакумэнтах па-беларуску. Але беларусы змагаліся за сваё. Пасьля 2-й Сусьветнай вайны беларусы сталі "сусьветнай нацыяй", гэта значыць, што, як і бальшыня іншых народаў, яны сталі жыць на ўсіх кантынэнтах, у шмат якіх краінах за мяжой, і, галоўнае, сталі падтрымліваць там сваё культурна-нацыянальнае існаваньне.

*Для развагі.* Паводле дасьледаваньняў, праведзеных НІСЭПД у верасьні 2003г., 40 % дарослага насельніцтва хацелі б кудысьці эміграваць, хаця ў краіне няма ніякіх міжканфэсійных, міжэтнічных альбо іншых канфліктаў. Прычым, паводле Міністэрства працы, большасьць з гэтых 40 адсоткаў гатовыя працаваць за мяжой "на любых умовах". Найбольш схільныя зьмяніць краіну пражываньня маладыя адукаваныя беларусы – выпускнікі сярэдніх і вышэйшых установаў (больш за 75 %). Такі высокі эміграцыйны патэнцыял прынята тлумачыць сацыяльна-эканамічнымі й палітычнымі прычынамі: большасьць з апытаных людзей незадаволеныя разьвіцьцём дэмакратыі ў краіне, станам правоў чалавека, адсутнасьцю палітычных ды эканамічных свабод. І слова стабільнасьць, якім так ганарацца нашыя цяперашнія ўлады, для гэтых людзей азначае стабільную немагчымасьць наладзіць нармальнае годнае жыцьцё на Радзіме. І наогул, стабільнасьць у наш дынамічны час ужо даўно ня мае станоўчага сэнсу. Бо за нашую сёньняшнюю стабільнасьць будзем расплочвацца ня толькі мы, але й наступныя пакаленьні.

Аднак нежаданьне прыкладаць намаганьні, каб зьмяніць сытуацыю да лепшага ў сябе дома й будаваць сваю будучыню на Радзіме, цяжка растлумачыць толькі эканамічнымі прычынамі. Тое, што каля 3 мільёнаў людзей упэўненыя, што для рэалізацыі пасьпяховай кар'еры моладзі

лепш паехаць за мяжу, тлумачыцца элемэнтарнай грамадзянскай неадукаванасьцю гэтых людзей. На жаль, сярод гэтых людзей ёсьць вялікі адсотак бацькоў, настаўнікаў, шчыра жадаючых навучыць сваіх дзяцей, як і дзе знайсьці лепшую долю, тым самым пазбаўляючы пэрспэктывы ня толькі іх, але й краіну*.

## Тэма 2 : Рок і незалежнасьць

Да пачатку паседжаньня гучыць беларуская рок-музыка (гурты НРМ, Крама, Нэйрадзюбель, Уліс, інш)

*Уступ*

– прадстаўленьне тэмы й мэты сустрэчы, экспэртаў;

– абмен думкамі. Вядоўца прапануе пачаць з адказаў на пытаньні: “Што для мяне значыць рок?” і “Што для мяне значыць незалежнасьць?” Адказваюць па чарзе ўсе ўдзельнікі й экспэрты.

*Правілы клюбу:*

– выказвацца ад сябе (Я-выказваньне);

– не крытыкаваць асобу (але ня думку);

– не перапыняць, але захоўваць рэглямэнт;

– слухаць і чуць;

– выказвацца ня больш за 2 хвіліны, але гэта ня тычыцца экспэртаў.

На сьценцы 2 аркушы паперы:

– мае прапановы й заўвагі;

– прапаную тэму.

*Пытаньні для дыскусіі.*

**Пытаньне 1**. Якія настроі адлюстроўвае рок і якія рысы маюць людзі, якія слухаюць рок?

Рок – гэта музыка пратэсту ці ўцёкі ад рэальнасьці?

**Пытаньне 2.** Якая глеба патрэбная для рок-музыкі? Ці ёсьць глеба для разьвіцьця беларускай рок-музыкі?

---

** Гл.: Мацкевіч Т. Грамадзянская адукацыя ў школе. Бюлетэнь ТБШ. № 6, 2004.

**Пытаньне 3.** Ці ўзаемазьвязаныя паміж сабой паняцьці “рок” і “незалежнасьць”? Якія пэрспэктывы беларускага року?

## Тэма 3: Пад якім сьцягам?

*Уступ*

Вітаньне новых удзельнікаў, знаёмства (кожны піша на аркушы паперы сваё імя).

На сьцяне мапа Эўропы. Кожная краіна прадстаўленая выявай гербу й сьцягу.

*Правілы дыскусіі:*

– слухаць і чуць;

– не перапыняць;

– выказвацца ад сябе.

*Уводзіны* (Слова бярэ вядоўца).

Кожная краіна, кожны народ адрозьніваецца ад іншых: моваю, звычаямі, вопраткай, выглядам. Кожны народ і краіна маюць свае знакі. Гэта – герб і сьцяг. Гербы й сьцягі людзі прыдумалі даўно. Рыцары малявалі знакі свайго роду – гербы на шчытах. Па гербах на шчытах і па каляровых сьцягах ваяры маглі ў гарачым баі пазнаць, дзе свае, а дзе чужынцы. Лічылася, што войска, якое страціла сьцяг, пацярпела паразу й пакрылася ганьбай. Таму сьцяг берaглі як вока.

Пасьля ўступу да тэмы вядоўца пачынае задаваць аўдыторыі розныя пытаньні, спрабуючы выклікаць удзельнікаў на дыскусію.

***Пытаньні для дыскусіі***

**Пытаньне 1.** Што ёсьць для моладзі нацыянальная сымболіка?

**Пытаньне 2.** Дзяржаўная сымболіка: пытаньне культурнае ці палітычнае?

**Пытаньне 3.** Ці маюць беларусы праблемы з пачуцьцём годнасьці?

Пасьля таго як дыскусія будзе завершаная, слова перадаецца экспэрту.

Экспэрт дае зьвесткі пра гісторыю сымбаляў эўрапейскіх краінаў: калі яны ўзьніклі, чаму маюць такія колеры, паводле якіх геральдычных прынцыпаў пабудаваныя. Вельмі добра выкарыстаць для ілюстрацыі кампутарную прэзэнтацыю Power Point.

Пасьля выступу экспэрта ўдзельнікам зноў прапануецца распачаць дыскусію на пытаньні, агучаныя экспэртам.

## Тэма 4: Аб'яднаная Эўропа: элемэнты збліжэньня й супрацьстаяньня

На гэтую тэму прапануем два варыянты правядзеньня дыскусіі. Першы – для менш падрыхтаванай аўдыторыі. Ён прадугледжвае наяўнасьць экспэрта, з дапамогай якога ўдзельнікі знаёмяцца з тэмай. Зь ім можна арганізаваць дыскусію для пачаткоўцаў.

Другі варыянт – дэбаты – патрабуе часу на падрыхтоўку. Ён вельмі эфэктыўны для зьяднанае каманды.

### I варыянт

*Уступ*

Вітаньні, знаёмства новых удзельнікаў.

*Правілы Дыскусійнага клюбу:*

– выказвацца ад сябе (Я-выказваньне);

– не крытыкаваць асобу (але ня думку);

– не перапыняць, але захоўваць рэглямэнт;

– слухаць і чуць.

Вывешваецца мапа Эўропы. Бярэцца аркуш фармату А3. Удзельнікам прапануецца назваць краіны, якія сёньня ёсьць сябрамі Эўрапейскага Зьвязу, а таксама робіцца агляд краінаў-кандыдатаў. Усё гэта запісваецца.

Вядоўца (мадэратар) задае розныя пытаньні ўдзельнікам з мэтай высьветліць іхныя веды па дадзенай тэме. Такімі пытаньнямі могуць быць:

- Ці ведаеце Вы, як і чаму быў утвораны Эўрапейскі Зьвяз?

- Якія ў ім органы кіраваньня?
- Ці адчуваюць беларусы сябе эўрапейскім народам?
- Чаму у нас шмат назваў фірмаў, крамаў, радыёстанцыяў утрымліваюць слова *Эўропа*, але амаль няма слова *Азія*? (Прыклады: “Эўропа+”, унівэрсам “Эўрапейскі”, “Эўраопт”, эўрарамонт...)

***Пытаньні для дыскусіі***

**Пытаньне 1.** Якія, на вашую думку, плюсы й мінусы існаваньня эўрапейскай супольнасьці?

**Пытаньне 2.** Ці ёсьць пагрозы страты нацыянальнага сувэрэнітэту для краінаў, якія ўступаюць у Эўразьвяз?

**Пытаньне 3.** Ці мае Беларусь шанец далучыцца да Эўразьвязу? Пры якіх умовах?

Пасьля ўступу вядоўца альбо экспэрт праводзіць паказ кампутарнай прэзэнтацыі PowerPoint, падрыхтаванай па тэме. Для школьнага дыскусійнага клюбу экспэртам можа быць настаўнік геаграфіі альбо журналіст мясцовай газэты, які распавядзе пра Эўразьвяз.

У нашым выпадку прэзэнтацыя была падрыхтаваная адным з удзельнікаў на прыкладзе Польшчы. У ёй паказваюцца аналітычныя дыяграмы. Так, напрыклад, выкарыстоўваюцца вынікі апытаньняў насельніцтва Польшчы:

- Ці ведаеце Вы прычыны, зь якіх Польшча дамагаецца сяброўства ў ЭЗ?
- Ці гутарыце Вы пра ўступленьне Польшчы ў ЭЗ са сваімі сваякамі, сябрамі, суседзямі?
- Што перадусім: трансфармацыя ці інтэграцыя? (у Польшчы, Літве, Венгрыі, Чэхіі)
- Ці будзе карысным для Польшчы, ЭЗ увядзеньне візаў для грамадзянаў Беларусі, Расеі, Украіны пры перасячэньні мяжы з Польшчай?
- Вы галасавалі “За” ці “Супраць” уступленьня ў ЭЗ?
- Як Вы лічыце, уступленьне Польшчы ў ЭЗ для Вас прынясе:
  - *больш карысьці, чым стратаў;*
  - *больш стратаў, чым карысьці;*
  - *аднолькава карысьці й стратаў.*

Страхі перад стратаю незалежнасьці ў Польшчы, Чэхіі, Вугоршчыне.

Магчыма таксама паказаць відэаролікі з элемэнтамі прапаганды, якія выкарыстоўваліся напярэдадні правядзеньня рэфэрэндуму па ўступленьні ў ЭЗ у Латвіі.

Пасьля паказу прэзэнтацыі даецца слова экспэрту, які дае камэнтар па тэме, а таксама робіць кароткі даклад наконт актуальнай сытуацыі. Пасьля дакладу экспэрт задае пытаньні ўдзельнікам, каб выклікаць іх на дыскусію.

Што будзе, калі Беларусь далучыцца да Эўразьвязу?

**II варыянт.**

Другім варыянтам правядзеньня дыскусіі на тэму “Аб’яднаная Эўропа: элемэнты збліжэньня й супрацьстаяньня” ёсьць мэтад дэбатаў. Гэты мэтад патрабуе сур’ёзнай папярэдняй падрыхтоўкі ўдзельнікаў.

***Спосаб правядзеньня:***

Дэбаты патрэбныя для самастойнай распрацоўкі аргумэнтаў у спрэчных тэмах.

Гэты мэтад дазваляе дамагчыся актыўнага ўдзелу з мэтаю атрымаць больш інфармацыі, а таксама кантраляванага абмену аргумэнтамі.

Вядоўца тлумачыць, якім чынам будуць праходзіць дэбаты (асабліва важна, калі дэбаты праводзяцца ўпершыню).

Вядоўца падзяляе ўдзельнікаў напалам, садзіць за сталы, выстаўленыя паабапал клясы, і раздае ім аркушы паперы (А1), на якіх ёсьць 2 розныя пазыцыі.

“Далучэньне Беларусі да ЭЗ ў пэрспэктыве карыснае, бо...”

“Я супраць далучэньня Беларусі да ЭЗ, бо...”

*Падрыхтоўка*

На гэтай стадыі фармуюцца дзьве групы. Першая група шукае аргумэнты “за”, а другая – “супраць”. У часе фазы падрыхтоўкі раім дадаваць у групавую гульню разнастайныя другарадныя матэрыялы (газэтныя артыкулы, невялікія тэксты). Групы маюць пазнаёміцца з адпаведнымі аргумэнтамі.

*Уласна дэбаты*

Дыскусія вядзецца паводле наступных правілаў:

– Кожны бок прызначае некалькі ўдзельнікаў, якія сядаюць за стол адзін насупраць другога.

– Арганізатар дыскусіі адкрывае дэбаты й дае выступіць кожнаму боку.

– Пачынае дэбаты (прыкладам) рэпрэзэнтант групы "за". Ён выступае на працягу пэўнага часу (прыкладам, 1 хвіліны), пасьля слова даецца рэпрэзэнтанту ад групы "супраць", пасьля зноў удзельнік з групы "за" і г.д.

– Часу, вылучанага для кожнага выступу, удзельнікі маюць строга прытрымлівацца. Удзельнікі дыскусіі мусяць спыніць выступоўца па тым, як умоўлены час скончыўся. На выступ мае выдавацца ад 30 сэкундаў да 1 хвіліны.

– Па тым, як кожны ўдзельнік меў магчымасьць выступіць і кола "замкнулася", вяртаемся да пачатковага пункту.

– Пры канцы дэбатаў мае адбыцца супольны пленум ці галасаваньне.

*Час*

30-40 хвілінаў аддаецца на падрыхтоўку, 15-20 хвілінаў на дэбаты й 15-20 хвілін на падсумаваньне.

## ЧАСТКА III

## МАГЧЫМАСЬЦІ ДАЛУЧЭНЬНЯ ДА ЭЎРАПЕЙСКІХ ПРАГРАМАЎ

Такіх праграмаў нямала. Адзін з прыкладаў – праграма "Моладзь", якая спрыяе мабільнасьці й нефармальнай адукацыі маладых людзей. Праз гэтую праграму Эўрапейскія школьныя клюбы могуць беспасярэдне кантактаваць з раўналеткамі ў краінах ЭЗ, атрымліваць дадатковыя адукацыйныя й іншыя магчымасьці. Прапануем вашай увазе кароткі яе агляд.

Праграма акцыяў "**Моладзь**" Эўрапейскай Супольнасьці прапануе фінансаваньне разнастайных пэрспэктываў для маладых людзей ва ўзросьце 15-25 гадоў – жыхарамі 30 краінаў (15 краінаў-удзельніц Эўразьвязу ды іншых краінаў, якія ўваходзяць у праграму), а таксама іншых краінаў, якія могуць браць удзел у праграме (гл. ніжэй).

Праграма разьлічаная на сем гадоў (2000-2006) з агульным бюджэтам 520 млн. эўра. Яна яднае ранейшыя праграмы “**Моладзь для Эўропы**” й “**Эўрапейская валянтэрская служба**”.

Прагрaма “Моладзь” намагаецца забясьпечыць маладым людзям магчымасьць падарожжаў і шанец актыўна ўдзельнічаць у жыцьці дынамічнай Эўропы. Мэта праграмы: спрыяць супрацы ў сфэры моладзевай палітыкі на базе нефармальнай адукацыі й трэнінгаў, праз досьвед і абмен моладзі й моладзевых супрацоўнікаў у Эўразьвязе, праграмных і трэціх краінах.

Прагрaма “Моладзь” на эўрапейскім роўні дае маладым людзям, моладзевым супрацоўнікам і іншым людзям, якія маюць адказную пасаду ў моладзевай сфэры, абшар для вывучэньня, экспэрымэнтаў і інавацыяў. Гэта інтэгруе дасягнуты досвед, спрыяе пошукам, інавацыям, якасным дзеяньням у межах пяці акцыяў праграмы.

Прагрaма “Моладзь” і яе акцыі адбываюцца ў межах агульных стратэгіяў дзеяньняў краінаў – сяброў Эўразьвязу дзеля карысьці й разьвіцьця моладзі. Гэтыя стратэгіі маюць мэтай:

- *спрыяньне маладым людзям атрымаць веды, здольнасьці й навыкі, якія дапамогуць ім у іхным будучым разьвіцьці*
- *падтрымку маладзёвых ініцыятываў, прадпрымальніцтва й крэацыйнасьці*
- *спрыяньне актыўнаму ўдзелу маладых людзей у грамадзтве й усьведамленьню іх як адказных грамадзянаў*
- *падтрымку маладых людзей у іхным жаданьні рабіць актыўны ўклад у стварэньне Эўропы й ва ўзмацненьне пачуцьця эўрапейскай еднасьці*
- *дапамогу у выхаваньні павагі да правоў чалавека й змаганьні з расізмам і ксэнафобіяй*
- *супрацу ў моладзевай сфэры, дапамогу маладым людзям убачыць Эўразьвяз як частку гістарычнага, палітычнага, культурнага й сацыяльнага асяродзьдзя.*

Прагрaма “Моладзь” складаецца зь пяці так званых акцыяў: *Акцыя 1* (Моладзь для Эўропы), *Акцыя 2* (Эўрапейская валянтэрская служба), *Акцыя 3* (Моладзевыя ініцыятывы), *Акцыя 4* (Супольныя акцыі) і *Акцыя 5* (Акцыі дзеля падтрымкі).

## Краіны, якія могуць удзельнічаць у праграме

### 1. Праграмныя краіны

Краіны, якія могуць удзельнічаць ва ўсіх пяці акцыях праграмы “Моладзь”, называюцца праграмнымі краінамі. Гэта:

– **15 краінаў Эўразьвязу (ЭЗ):** Аўстрыя, Бэльгія, Данія, Фінляндыя, Францыя, Нямеччына, Грэцыя, Ірляндыя, Італія, Люксэмбург, Нідэрлянды, Партугалія, Гішпанія, Швэцыя, Вялікабрытанія.
– **Тры краіны Эўрапейскай асацыяцыі вольнага гандлю (EFTA) – сябры Эўрапейскай эканамічнай прасторы (EEA):** Ісьляндыя, Ліхтэнштайн, Нарвэгія.
– **Краіны – кандыдаты на ўступ у ЭЗ (12 краінаў):** Вугоршчына, Кіпр, Латвія, Літва, Мальта, Польшча, Славаччына, Славенія, Чэхія, Эстонія, Румынія, Баўгарыя*.

**2. ЭўраМэд і Трэція краіны**

Гэта краіны ў іншых частках сьвету, якія могуць удзельнічаць у Акцыях 1, 2 і 5 праграмы "Моладзь". Беларусь уваходзіць у сьпіс *Прыярытэту 1 (СНД):* Арменія, Азэрбайджан, Беларусь, Грузія, Малдова, Расея, Украіна.

**Асаблівасьці супрацоўніцтва з "трэцімі" краінамі**

Праз падтрымку моладзевага супрацоўніцтва з трэцімі краінамі Эўрапейская камісія мае мэтай пабудаваць доўгатэрміновае грунтоўнае партнэрства, а таксама стымуляваць абмен досьведам у моладзевай працы й ноў-хаў паміж няўрадавымі й дзяржаўнымі структурамі Эўразьвязу й трэціх краінаў. Дзейнасьць у межах праграмы "Моладзь" з трэцімі краінамі дазваляе ўдзельнікам лепей зразумець іхны стан, культуру, асаблівасьці.

**Крытэры й асаблівасьці працы з трэцімі краінамі**

- Толькі *Акцыя 1* (Моладзь для Эўропы), *Акцыя 2* (Эўрапейская валянтэрская служба) і *Акцыя 5* (Акцыі падтрымкі) адкрытыя для супрацы з трэцімі краінамі.
- Праекты павінны ўключаць у сябе трэція краіны з аднаго рэгіёну (напрыклад, СНД).
- Краіны-кандыдаты на ўступ у Эўразьвяз і краіны Эўрапейскай эканамічнай прасторы/Эўрапейскай асацыяцыі вольнага гандлю, што ўдзельнічаюць у праекце, ня могуць перавышаць колькасьць эўразьвязаўскіх краінаў.

*** Заўв. рэд.: З 1 траўня 2004 г. 10 краінаў з 12, апрача Румыніі й Баўгарыі, сталі правадзейнымі сябрамі ЭЗ.

**Хто можа ўдзельнічаць?**

Маладыя людзі ва ўзросьце 15-25 год уключна, моладзевыя асацыяцыі й мясцовыя НДА, якія легальна жывуць/знаходзяцца ў адной з трэціх краінаў і ў 15 краінах Эўразьвязу.

У дадатак да агульных палажэньняў праграмы “Моладзь”, акрэсьленыя ў Даведніку карыстальніка, дзейнасьць у трэціх краінах павінна адпавядаць наступным асобным крытэрам для кожнай акцыі:

*Акцыя 1 – Моладзь для Эўропы, сумесна з трэцімі краінамі*

- Яны павінны быць шматнацыянальнымі й уключаць прынамсі чатыры краіны.
- Яны павінны ўключаць прынамсі дзьве краіны ЭЗ.
- Яны павінны ўключаць прынамсі дзьве краіны аднаго рэгіёну трэціх краінаў.
- Мусіць быць балянс паміж колькасьцю праграмных краінаў і трэціх краінаў у кожным праекце. Нацыянальныя групы павінны быць збалянсаваныя й складацца прыкладна з аднолькавай колькасьці ўдзельнікаў.

*Акцыя 2 – Эўрапейская валянтэрская служба, з трэцімі краінамі*

- Колькасьць валянтэраў: да 20 валянтэраў у адным праекце.
- Колькасьць валянтэраў з прымаючага боку абмежаваная чатырма, зь якіх ня больш за два могуць быць з адной краіны.
- Перамешваньне дасылаючых краінаў: Калі ў праекце больш за два валянтэры, яны павінны быць з розных краінаў сталага знаходжаньня ў збалянсаванай колькасьці.

*Акцыя 5 – Акцыі падтрымкі, з трэцімі краінамі*

- Від дзейнасьці 9 (падтрымка якасьці й інавацыяў) не распаўсюджваецца на супрацу з трэцімі краінамі. Таксама не падтрымоўваецца дзейнасьць у межах *Акцыі 3* і *Акцыі 4* праграмы “Моладзь”.
- Супраца павінна быць шматнацыянальная, г. зн. прынамсі чатыры краіны-ўдзельніцы.
- Сярод іх мусяць быць прынамсі дзьве праграмныя краіны (зь якіх прынамсі адна павінна быць краінай ЭЗ).
- Яны павінны ўключаць прынамсі дзьве трэція краіны з аднаго рэгіёну.
- Віды дзейнасьці 1 (стажы / акрэсьленьне працы) і 2 (паездкі дзеля выкананьня), а таксама дзейнасьць з мэтаю разьвіваць эўрапейскі

валянтарыят (рух дабрахвотнікаў) з трэцімі краінамі, могуць уключаць толькі дзьве ці тры партнэрскія краіны.

**Як падаць заяўку?**

- Аплікацыі павінны быць пададзеныя своечасова да цэнтралізаваных тэрмінаў падачы (1 лютага, 1 чэрвеня, 1 лістапада).
- Усталюй і ўзгадні праграму праекту разам з партнэрскімі арганізацыямі. Толькі адна каардынацыйная арганізацыя адказвае за падачу аплікацыі, а таксама за выкананьне праекту. Яна атрымае грант на ўвесь праект і будзе адказваць за перадачу іншым партнэрам іхнае часткі гранту. Арганізацыя-каардынатар таксама адказвае за справаздачу й прадастаўленьне выніковых разьлікаў.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць на старонцы europa.eu.int/comm/youth/. Прапануецца зьвярнуць асаблівую ўвагу на User’s Guide і сьпіс нацыянальных агенцтваў у праграмных краінах, якія могуць дапамагчы ў пошуку партнэраў.

*Кароткія зьвесткі пра аўтараў*

**Вольга Каляда** – намесьніца дырэктара Ждановіцкай сярэдняй школы Менскага раёну.

**Тамара Мацкевіч** – кіраўніца адукацыйнага аддзелу ГГА "Цэнтар Супольнасьць". Каардынатар праграмы "Настаўнік. Школа. Грамадзтва" – праграмы мэтадычнай і грамадзянскай адукацыі настаўнікаў. Скончыла фізычны факультэт БДУ, выкладае фізыку ў Гуманітарным ліцэі імя Якуба Коласа.

**Алена Кулаева** – сябра ГГА "Цэнтар Супольнасьць" і РГА "Таварыства беларускай школы". Каардынатар праграмы "Настаўнік. Школа. Грамадзтва". Паводле адукацыі сацыяльны пэдагог.

**Радаслава Вячорка** – кіраўніца Менскага моладзевага дыскусійнага клюбу. Студэнтка БДЭУ.